Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

САКАВІК 13 АЎТОРАК 1934 г. № 56 (4889)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцес

ЦК КП(б)Б--БУДАЎНІКАМ МЕНСКАЙ ЦЭЦ

ЦК КП(б)Б шле большэвіцкае прывітанне кіраўнікам, рабочым і спецыялістам будаўніцтва Менскай ЦЭЦ у дзень яе пуску.

ЦК шле прывітанне комсамольцам будоўлі, не мала папрацаваў шым на пабудове і па мантажу станцыі, якая з'яўляецца новым буйным поспехам у справе далейшай індустрыялізацыі Совецкай Беларусі.

ЦК выказвае ўпэўненасць, што рабочыя, спецыялісты і кіраўні ЦЭЦ будуць упарта змагацца за асваенне тэхнікі, абсталявання, я поўнай магутнасці і за бесперабойную работу станцыі.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

АБ МЕРАХ К РАЗВІЦЦЮ КАНОПЛЯВОДЧАЙ ГАСПАДАРКІ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

У мэтах большай гаспадарчай зацікаўленасці калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у развіцці сваёй канопляводчай гаспадаркі і павышэнні ўраджайнасці канапель Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанаўляюць:

1. Вызваліць ад абавязковай пастаўкі бульбы дзяржаве і ад здачы дзяржаве гародніны, па абавязковай кантрактацыі калгасы, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, пасеяўшых канопліі на сядзібных, прысядзібных і пойменных угоддзях і выканаўшых свае абавязацельствы, у адпаведнасці з кантрактацыйнымі дагаворамі, па здачы пяньки дзяржаве на тую колькасць гектараў, якая на сядзібных, прысядзібных і пойменных угоддзях была занята канопляміі.

Пашырыць гэту ільготу на пасевы канапель калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў на сядзібных, прысядзібных і пойменных угоддзях, праведзеныя як увесну 1934 г., так і ў наступныя гады.

2. Падвоіць нормы продажы па цвёрдых дзяржаўных цэнах хлеба калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам і ўстанавіць, пачынаючы з 15-га сакавіка, продаж хлеба на кожны зданы цэнтнер пяньки валакна ў наступных размерах: для калгасаў—3 цэнтнеры, для калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў—2,5 цэнтнера.

3. Павысіць нормы продажы па цвёрдых дзяржаўных цэнах расліннага алею і макухі здатчыкам, устанавіўшы наступныя размеры выдачы на кожны цэнтнер зданага дзяржаве насення канапель (у кг.):

	Масла	Макухі
Калгасы	6	12
Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі	5	10

4. Устанавіць павышаную ацэнку ў прападніх для калгаснікаў, занятых па мочцы, сушцы і мяцці канапель, залічваючы два прападні за выкананне дзённай нормы выпрацоўкі, устаноўленай дзейнымі расцэнкамі.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) І. СТАЛІН

11 сакавіка 1934 г.

ДЫСЦЫПЛІНА ВЫРАШАЕ

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб Данецкай дарозе, якая змешчана ў мінулым нумары «Звязды», па свайму значэнню выходзіць далёка за межы адной гэтай дарогі. Канкрэтызуючы прынцыповыя ўстаноўкі XVII з'езда партыі, у пастанове дан глыбокі аналіз адставання ўсяго чыгуначнага транспарта і паказана праграма канкрэтных большэвіцкіх дзеянняў. Вось чаму кожная дарога, кожны чыгуначны раён, станцыя і кожны работнік чыгункі павінны вынесці ўрокі з гэтай пастановы.

«На Данецкай дарозе,—гаворыцца ў пастанове ЦК і СНК,—да гэтага часу яшчэ пануюць усе тыя недахопы, якія былі адзначаны ў ліпеньскай пастанове Совета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб рабоце НКШЗ. Канцылярска-бюракратычны метад кіраўніцтва знаходзіць, у прыватнасці, сваё выражэнне на дарозе ў адарванасці яе кіраўніцтва ад перыферыі, раёнаў, дэпо, станцый і дыстанцый».

Трэба з усёй рашучасцю падкрасліць, што хваробы, якія ёсць на Данецкай дарозе, ёсць і ў нас, у чыгуначных раёнах БССР. Кіраўніцтва чыгуначных раёнаў яшчэ не перабудавалася, сядзіць у канцылярыі, не кіруе аператыўна станцыямі, дэпо, дыстанцыямі — асноўнымі пунктамі, якія вырашаюць поспех перавозак. Усё яшчэ пераважае канцылярска-бюракратычны «стыль» у рабоце і кіраўніцтве.

Функцыянапка, безадказнасць і абязлічка пануюць і на самых станцыях. Нядаўна ў «Звяздзе» быў змешчан артыкул аб ст. Віцебск, дзе за пагрузку няма адказнай асобы, дзе начальнік станцыі не кіруе, а фіксуе толькі становішча, дзе загады выдаюцца, але не выконваюцца і ніхто не правярае іх выканання. Падобныя факты можна знайсці ў любым раёне.

Дысцыпліна на транспарце—жорсткая, жалезная дысцыпліна — важнейшая ўмова выразнасці работы. Камандзір транспарта павінен паказваць узоры дысцыплінаванасці, узоры дакладнага і хуткага выканання загаду вышэйшага кіраўніцтва. Гэта яшчэ раз падкрэсліваецца ў пастанове ЦК і СНК аб Данецкай дарозе.

Як-жа ў нас абстаіць з гэтым справа?

Камандзіры ва многіх выпадках парушаюць загады, падрываюць дысцыпліну, служаць не станоўчым прыкладам для ўсёй масы чыгуначнікаў, а наадварот—сваёй расхлябанасцю спрыяюць разпажэнню дысцыпліны.

Як вядома, невыкананне рэгуліровачнага загаду НКШЗ, паводле якога рэгулюецца вагонны парк па ўсяму Саюзу, з'яўляецца самым яркім прыкладам недысцыплінаванасці камандзіраў транспарта. ЦК і СНК ў сваёй пастанове аб Данецкай дарозе папярэдзілі начальнікаў раду дарог, у тым ліку і Заходняй, што затрымка ў адпраўцы грузаў і паражняка на Данецкую дарогу будзе разглядацца, як парушэнне партыйнай і совецкай дысцыпліны. Гэта папярэджанне ў роўнай ступені адносіцца і да начальніка ЖЛОБІНСКАГА чыгуначнага раёна ЕРАМАЕВА, які сістэматычна не выконвае рэгуліровачнага загаду. Па ЕРАМАЕВУ раўнялюцца і падначаленыя. Вось на тойжа станцыі Жлобін начальнік БЕЛЬЦОЎ не пічыць для сябе абавязковым выконваць загады начальніка дарогі. Начальнік дарогі прыслаў загад — максімальна скараціць пагрузку ў крытых канвеіцыйных вагонах і перакінуць іх Данбэсу. Але Бельцоў загад абышоў. Ён па-старому прадаўжае пагрузку ў гэтых вагонах. 8 сакавіка, напрыклад, ён загрузіў 8 вагонаў і каб утаіць сваё злачынства, прапанаваў канторы не афармляць пагрузку дакументальна. Злачынныя адносіны да выканання рэгуліровачнага загаду маюць месца не толькі ў Жлобінскім раёне. Аналагічныя факты ёсць і ў ГОМЕЛЬСКІМ, ВІЦЕБСКІМ і АРШАНСКІМ раёнах.

Пастанова ЦК і СНК зварачае асаблівую ўвагу на неабходнасць барацьбы за дзяржаўную дысцыпліну, за дакладнае выкананне прана пагрузкі, падкрэсліваючы, што «паза планавыя перавозкі з'яўляюцца не толькі парушэннем дзяржаўных планаў пагрузкі, але і ашуканнем дзяржавы, выклікаемым у радзе выпадкаў карыснымі пабуджэннямі». Да работнікаў транспарта і партыйна-совецкіх арганізацый, падрываючых планы перавозак, арганізуючых, або штурхаючых на арганізацыю нелпланавых перавозак грузаў, бяручых або даючых хабары і садзейнічаючых раскрадванню дзяржаўнай маемасці, будзе прымяняцца закон ад 7 жніўня 1932 г. аб охове социялістычнай маемасці.

Гэта з'яўляецца сур'ёзным папярэджаннем і для кіраўнікоў раёнаў і станцый БССР. Факты паказваюць, што ніякай дысцыпліны ў пагрузках на станцыях чыгунак БССР няма. Возьмем МЕНСКУЮ станцыю. Яна ў лютым выканала адказны план пагрузкі ўсяго толькі на 89,5 проц. Між тым у гэты час яна правяла вялікія грузавыя аперацыі ПА-ЗА ПЛАНАМ. Гэтыя нелпланавыя перавозкі часткай санкцыянаваліся кіраўніцтвам раёна, а часткай праводзіліся самім кіраўніцтвам станцыі (начальнік ЛАДЗІШ). На станцыі лічылі, што раз кіраўніцтва раёна дазваляе нелпланавыя перавозкі, то чаму-б і Ім не быць «добранькімі за кошт дзяржавы». У рэзультаце ў першай дэкадзе лютага кіраўніцтвам раёна было дазволена пагрузіць па-за планам 181 вагон, а фактычна пагружана 257; у другой дэкадзе адпаведна 65 і 155, і ў трэцяй дэкадзе — 70 і 221. Не скараціліся нелпланавыя перавозкі і ў сакавіку. За першую дэкаду пагружана 189 вагонаў па-за планам.

Зусім ясна, што тут грубае парушэнне планавай дысцыпліны, за якую вінаватыя павінны панесці заслужанае пакаранне. Гэты факт разам з тым сведчыць аб тым, што ў кіраўніцтве раёнаў планы перавозак складаюцца неахайна, другараднымі работнікамі, без неабходнага ўліку першачарговасці перавозак. У гэтым святле выключнае значэнне мае тое месца ў пастанове ЦК і СНК, дзе сказана, што планы перавозак павінны складацца і падпісвацца асабіста начальнікамі дарог і раёнаў, а адказнасць за выкананне плана пагрузкі станцыямі ўскладаецца асабіста на начальнікаў станцый.

Недахопы работы транспарта ў дастатковай ступені выяўлены. Партыя і ўрад далі разгорнутую праграму іх ліквідацыі. Чарга — за справай.

Галоўнае —ЗНІШЧЫЦЬ КАНЦЫЛЯРСКА - БЮРАКРАТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ РАБОТЫ, ведаць сапраўднае становішча спраў на станцыі, дыстанцыі, дэпо і аператыўна кіраваць імі. Галоўнае — У АРГАНІЗАЦЫІ ЛЮДЗЕЙ, у высокай дысцыпліне і праверцы выканання.

Вышэй боездольнасць партыйнай арганізацыі транспарта!

РАБОЧЫМ, ІТР І СЛУЖАЧЫМ МЕНСКАЙ ЦЭЦ

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР у дзень адкрыцця Менскай ЦЭЦ шле палкае прывітанне яе будаўнікам.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, яе кіраўніка тав. ГІКАЛО, пры дапамозе рабочага класа працоўных усяго Совецкага Саюза—пабудавана першая чарга ЦЭЦ—сур'ёзнейшае звяно ў справе далейшага росту прамысловасці БССР.

Таварышы рабочыя і ІТР! Ад вас цяпер залежыць паспяховае асваенне станцыі і яе добрая работа.

Совет народных камісараў БССР упэўнен, што з асваеннем станцыі вы так-жа справіцеся, як справіліся з яе будаўніцтвам.

Няхай жыве арганізатар социялістычнай будоўлі—ВКП(б) і яе правадыр т. СТАЛІН!

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

На IV усебеларускім з'ездзе МОПР

Раніцай, 11 сакавіка, на з'ездзе з дакладам аб рабоце ЦК МОПР БССР выступіў акадэмік Т. ДОМБАЛЬ. Прывёўшы рад лічбаў, характарызуючых рост нашай мопраўскай арганізацыі, разгортванне брацкай інтэрнацыянальнай сувязі з палітвязнямі фашысцкіх турам, актыўны ўдзел мопраўцаў ва ўсім социялістычным будаўніцтве, дакладчык спыніўся на задачах МОПР БССР.

— Узброіўшыся гістарычнымі рашэннямі XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б,—заначыў тав. Домбаль,—наша арганізацыя МОПР павінна яшчэ больш рашуча змагацца за далейшы колькасны рост, за выкананне промфінплана, за рэалізацыю ўскладзеных на нас пачесных інтэрнацыянальных задач. Гістарычныя словы тав. Сталіна—«быць верным да канца справе пролетарскага інтэрнацыяналізма, справе брацкага саюзу пролетарыяў усіх краін» — павінны стаць пуцяводнай зоркай для кожнай мопраўскай ячэйкі, для кожнага мопраўца ў паасобку.

Мы павінны і будзем змагацца за тое, каб заняць адно з перадавых месц сярод шматмільённай армії баявых пролетарскіх інтэрнацыяналістаў нашага Совецкага Саюза.

Пасля слова старшыні рэвізійнай камісіі тав. ВАРОНІЧАВА разгарнуліся шырокія спрэчкі па дакладах т. т. Дзірдо і Домбаля. У спрэчках выказалася каля 40 чалавек, у тым ліку т. т. ФЕЦЮХІНА (Зах. вобласць), ВОНСАК (старшыня Менгаркома МОПР), КУЗНЕЦОЎ, ПЛОТКІН (Гомель), ЛЕВІН, СЦЕФАНОВІЧ (Барысаў), АУТУХОВІЧ (Орша), ЧАРНУХІН (Віцебск), АГУРЦОЎ (Полацк) і інш.

Шумнымі воплескамі спаткала зала дэлегацыю Заходняй Беларусі, якая паведаміла з'езду пра нечуваны тэрор раз'юшаных фашыстаў супроць рэвалюцыянераў Зах. Беларусі, Зах. Украіны і Польшчы, пра бес працоўе, жабрацтва працоўных мас па той бок мяжы, пра гераічную, самаадданую барацьбу брацкіх компартый супроць шалёнага наступу капіталу на рабочы клас.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд заслухаў прывітанні ад раду фабрык і заводаў Беларусі. Т. т. Шыдлоўскі і Шашнёў ад імя мопраўцаў віцебскага завода «Чырвоны металіст» перадалі ў прэзідыум падарунак — плуг і акучнік, спецыяльна зробленыя да з'езда ўдарнай брыгадай імя Дзімітрава. Тав. Ельсон—рабочы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» перадаў некалькі даіцячых касцюмаў — падарунак дзецям палітэмігрантаў. Работніца віцебскай фабрыкі імя Клары Цэткін тав. Гуткіна перадала некалькі пар высокаякасных панчох, спецыяльна выробленых брыгадай імя Е. Д. Стасавай у падарунак палітзняволеным.

Увечары-ж адбываліся выбары цэнтральных органаў і дэлегатаў на IV усесаюзны з'езд МОПР. У цэнтральны камітэт МОПР БССР выбрана 31 чалавек.

Пасля выбараў IV усебеларускі з'езд МОПР закончыў сваю работу.

Пленум нона-выбранага ЦК на сваім першым пасяджэнні вылучыў прэзідыум, у які ўвайшлі тт. акад. ДОМБАЛЬ (старшыня ЦК), РОЛЬБІН (адказны сакратар), СВЯРДЛОВА, ІОЗЕФ (т-ва паліткантаржан і ссыльна-паселенцаў), ВОНСАК і інш.

14 сакавіка ў 5 гадзін вечара, у памяшканні Дома Комасветы (был. клуб Карла Маркса)

АДКРЫВАЕЦЦА

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМА КП(б)Б

Менгарком КП(б)Б

УСЕ СІЛЫ НА ЗАВЯРШЭННЕ ПРАВЕРКІ НАСЕННЯ І МІЖКАЛГАСНАГА АБМЕНУ

ГОРКІ

АПТЫМІСТЫЧНЫЯ НАСТРОІ ГОРАЦКІХ БАЛБАТУНОЎ

У Горацкім райземаддзеле настроены аптымістычна:—пытаецеся, як з насеннем? Во! Усё да зерняці засыпана! Так гавораць агранам Чабатарэўскі, намеснік загадчыка райземаддзела Папоў і іншыя кіруючыя работнікі. А факты?

... Літаральна пад носам у райземаддзела і МТС—у калгасе імя Гікало кладаўшчык Штырыкаў пагнаіў звыш 100 пудоў пшаніцы і столькі-ж вікі. Калгаснікі не раз хацелі праверыць, як захоўваецца ў Штырыкава насенне. Аднак, ён да апошняга часу ніяк не хацеў і не дапускаў гэтай праверкі...

У калгасе «Авангард», Любжыскага сельсовета, згноена звыш 70 пудоў ільнанасення і каля 200 пудоў жыта. У гэтым-жа калгасе памарожана каля 200 пудоў бульбы. У калгасе «За ўладу совецкую», Кацялеўскага сельсовета, насенне раскрадзена; у апошні час «невядома куды знікла» 9 цэнтнераў ільнанасення, 5 цэнтнераў пшаніцы і 3 цэнтнеры аўса. Вартаўнік калгаса Свірыдаў Раман тлумачыць гэта знікненне вельмі проста:

— Гэта, можа быць, прапала тады, калі я закурваў...

Не лепш у раёне і з якасцю насення. Дагэтуль належнай праверкі якасці насення фактычна не было. Праўда, па ініцыятыве раённай газеты з 25 студзеня па 5 лютага быў арганізаван рэйд-праверка пад рыхтаванасці да сяўбы. Але ні земаддзел, ні МТС гэту ініцыятыву газеты не падхапілі і рэйд патрэбных вынікаў не даў. А ў Дрыбінскім, Любіжскім, Жланаўскім, Карэбскім, Асталопаўскім і інш. сельсоветах рэйд наогул быў сарваны.

А праверацъ ёсць што. У радзе калгасаў («Чырвоны сцяг», Бельскага сельсовета, і інш.), усхожасць пшаніцы не перавышае 20 проц. Шмат дзе не хапае аднаго насення і ёсць лішкі другога. У такіх умовах трэба было зараз-жа арганізаваць міжкалгасны абмен. Але балбатуны з Горацкага райземаддзела гэтым займацца не хочуць, хоць калгасы настойліва патрабуюць арганізацыі абмену.

Узяць хоць-бы калгас «Чырвоныя ўсходы», якому не хапае 25 цэнтнераў ільну, не хапае канюшыны, але мае лішкі гароху. Або ў калгасе «Комінтэрн», Асталопаўскага сельсовета, які мае лішкаў у 134 цэнтнеры жыта, але ў яго не хапае аўса. Тое самае ў калгасе імя Молатава, Жданаўскага сельсовета, які хоча вымяніць лён на віку.

Ведаюць аб гэтым і горацкія райземаддзельцы. Але, акапаўшыся ў габінетах, гэтыя аптымістычна настроеныя балбатуны не хочуць апусціцца ў калгасы, каб забяспечыць калгасныя палі высокаякасным насеннем.

Брыгада «Звязды»
Яўх. ГОЛЬДШВАРЦ, Віт. ДАЛЬ.

816 цэнт. чыстагатункновага насення прыгатовіў калгас для весняной сяўбы (насенне ачышчана і захоўваецца ў сухім свірне). На здымку насенне ячменю. (Калгас Вінніцкай вобласці, Чарнавецкага раёна).

РАСОНЫ

ПСУЮЦЬ і РАСКРАДВАЮЦЬ НАСЕННЕ

У раёне ніхто не ведае, чым прыдзецца сеяць у надыходзячую вясну. Насенныя фонды ў большасці калгасаў не засыпаны поўнацю. Ні ў адным з калгасаў не аб слугоўваемых МТС, насенне яшчэ не ачышчана і не праверана на ўсхожасць. Ільнанасення — вядучай культуры раёна—засыпана толькі 59 проц. Каля 20 проц. ільнанасення ў калгасах яшчэ не абмалочана. Дзесяткі цэнтнераў абмалочанага насення ляжыць у кучах на калгасных гумнах і псуецца.

У калгасе «Верацінa», Гарбачоўскага сельсовета, з патрэбных 60,2 цэнт., ільнасемя засыпана толькі 7,5. Астатняе ляжыць не абмалочаным у кучах. Большасць яго ўжо згніла. У гэтым калгасе захаванне ўсіх насенных фондаў даручана кулаку Гаўрыленку.

У калгасе імя 17 з'езда партыі частка насенных фондаў раскрадзе на падкулачнікамі. Сам старшыня гэтага калгаса Шкірман украў з засекаў 6 пудоў насення.

У калгасе «Будзёнавец», Дзіміт раўскага сельсовета, насенне ільну паказала ўсяго 6 проц. усхожасці.

Зараз яшчэ не позна і можна наладзіць міжкалгасны абмен насення, але загадчык райземаддзела Храноўскі мала аб гэтым думае.

У дэкаднік праверкі насенных фондаў у раёне амаль нічога не зроблена.

Райком і райземаддзел абмежаваліся толькі пасылкай калгасам «абавязковай пастановы», што на сенне трэба правяраць. Ні адзін работнік з раённага актыва не выехаў у калгас.

ФОНКАЦ.

ОРША

АБМЕН САРВАН

Старшыня калгаса «Чырвоны бераг» тав. Хазан моцна абуран:

Хіба-ж гэта парадкі. Прывёз я надоечы для абмену на добрае насенне ў аршанскі элеватар сваю пшаніцу. Пшаніцу не дрэнную 82 проц. усхожасці. Яе прынялі, а за раз мне ўзамен даюць адтуль пшаніцу ўсхожасцю ў 72 проц... Адным словам, памяняў быка на індыка, пакінуў калгас без насення...

Што гэта — памылка, выпадковасць, непаразуменне? Нічога падобнага. Гэта факт, які характарызуе сабой становішча абмену на аршанскім элеватары. Калгасы Аршаншчыны павінны былі абмяняць на элеватары 82 тоны пшаніцы, 32 тоны гароху і 96 тон вікі. Але... у элеватары ёсць 16 тон пшаніцы, нягоднай для пасеву (70 проц. усхожасці), 32 тоны гароху, таксама нягоднага (змесь 7 гатункаў, мяшаў загадчык тэхканторы Пузыраўскі).

Работнікі аршанскай канторы Заготзярно ківаюць на Белканторы: яны моў, вінаваты, не прысылаюць.

Як-бы там ні было, а абмен на элеватары сарван. У райземаддзеле (загадчык Касцюкевіч) бездапаможна разводзяць рукамі:

— Ну, што мы можам зрабіць? Не прысылаюць...

А што зроблена для таго, каб выкарыстаць унутраныя рэсурсы, каб арганізаваць міжкалгасны абмен?

— Тут у нас,—гаворыць тав. Касцюкевіч, — усё ў парадку: планы спушчаны, абмен на поўным ходу.

Фармальна гэта можа і так, а па сутнасці...

...Старшыня калгаса «Сазнанне» Пчолкін (Якаўлевіцкі сельсавет) заяўляе:

— План абмену насення я атрымаў. Але які з гэтага толк. Калі па гэтаму плану я абмяняю сваю бульбу, то ў сябе на 10 га не хапіць бульбянога насення.

Што гэта — паўторым — памылка, непаразуменне? Нічога падобнага. Гэта факт, які характарызуе райземаддзелаўскія «планы абмену». Справа, бачыце, вось чым. Так званыя планы складаліся без уліку пасеўных плацпаў, нават без дакладнага ўліку наяўнасці насення ў калгасах. Так скажаць, «груба прыблізна»... Больш таго, райземаддзел пальцам аб палец не ўдарыў, каб праверыць выкананне гэтых сваіх дутых планаў. А ў рэзультаце—калгасы абмяняюць. Або — адзін едзе абменьваць, а другі не хоча. Напрыклад, калгасы «Вызваленне жанчын» і «Ленінскі шлях», Браздзечанскага сельсовета

Некалькі слоў аб якасці насення. Тав. Касцюкевіч заяўляе:

— Калгасны авёс у нас не нижэй 90 проц. усхожасці, лён таксама; у 32 калгасах пшаніца нижэй 80 проц., у 36-ці такі-ж гарох, а ў 54-х такая-ж віка.

Аднак, верыць гэтым даным рызыкоўна. У калгасе «Другая пятігодка», Шыбецкага сельсовета. 6 цэнт. аўса—20-процантнай усхожасці. А такіх прыкладаў нямала.

Не шкодзіла-б аршанскім арганізацыям, шчыра прызнацца, што для іх гэта справа цёмная. І сапраўды, лабараторыя па праверцы ўсхожасці насення пры аршанскай МТС (загадчык лабаратоpыі Арцем'ева) план праверкі зрываў. Больш таго, даныя далёка не дакладныя. У калгасе «Чырвоны бераг» праверылі ячмень і знайшлі, што ўсхожасць 83 проц., а лабараторыя МТС па гэтаму-ж ячменю паказала ўсхожасць... 25 проц.

Д.

СТАНОВІШЧА У ІСПАНІІ АБВАСТРАЕЦЦА

ЗАБАСТОЎКІ Ў МАДРЫДЗЕ, УСЕАГУЛЬНЫЯ СТАЧКІ Ў ПРАВІНЦЫЯХ

БЕРЛІН, 10.

Згодна паведамлення мадрыдскага карэспандэнта «Берзен цэйтунг» увядзенне асаднага становішча ў Іспаніі яшчэ больш распаліла атмасферу ў краіне.

У рабочых кварталах наглядаецца велізарнае абурэнне. Сёння ўрад прыняў рад новых мер для прадухілення рэвалюцыйных выступленняў іспанскага пролетарыята. Компартыя Іспаніі забаронена; увесь комуністычны друк закрыт. Закрыты таксама социялістычнал арганізацыя моладзі і анарха-сіндыкалісцкі рабочы саюз.

У Мадрыдзе прадаўжаецца забастоўка металістаў і будаўнічых рабочых. У Барселоне забаставалі рабочыя электрастанцыі. Паліцыя праводзіць масавыя арышты сярод бастуючых рабочых. У Мадрыдзе ўчора арыштавана 300 рабочых.

Вярхоўны пракурор прадпісаў усім акруговым пракурорам з усёй рашучасцю спыняць дзейнасць усіх рабочых арганізацый, якія «ставяць сваёй задачай рэвалюцыйны пераварот».

* * *

ЛОНДАН, 11 (БЕЛТА).

У апошніх паведамленнях з Мадрыда з непакоем адзначаецца, што становішча ў Іспаніі абвастраецца.

«Обсервер» сумняваецца ў эфектыўнасці карных мер іспанскага ўрада і ставіць пытанне, ці мае ён «рэсурсы, каб справіцца з буйнымі сіламі, якія знаходзяцца ў становішчы такога вострава хвалявання».

Мадрыдскі карэспандэнт Рэйтэр заяўляе, што ў выпадку далейшага ўзмацнення рэпрэсій паўстануць усе як адзін і дадуць бой на вуліцы.

ПЕРАД УСЕАГУЛЬНАЙ СТАЧКАЙ

ПАРЫЖ, 11 (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Мадрыда, заўтра чакаецца пачатак усеагульнай забастоўкі ў Іспаніі. У Мадрыдзе бастуюць каля 70 тыс. металістаў. Транспарт і трамвайныя зносіны паралізаваны. Бастуюць будаўнічыя рабочыя. Друкары пастанавілі пачаць заўтра ўсеагульную забастоўку ва ўсёй Іспаніі. Прадаўжаюцца забастоўкі ў Сантангеры, Сеговіі, Валенсіі і Рыоцынто. Аб гатоўнасці абвясціць забастоўку заявілі рабочыя правінцыі Севільі і Барселоны.

У Валенсіі адбыліся сутычкі паміж забастоўшчыкамі і паліцыяй. Адзін рабочы цяжка ранен. Сутычкі адбыліся таксама ў Барселоне.

У Вілья Рубія сельска-гаспадарчыя рабочыя захвацілі памешчыцкія землі і сталі яе апрацоўваць. Прыбыўшую грамадзянскую гвардыю рабочыя прагналі. У Фуэнтедоль-Фрэнсо памешчыцкія землі былі захвачаны сялянамі.

Беспрацоўныя ў Іспаніі асуджаны на галоднае існаванне ў поўным сэнсе слова. Як паведамляюць газеты, беспрацоўныя хварэюцца лісцямі і карэннямі. Аранхуэзе жанчыны наладзілі дэманстрацыю перад булачнымі, патрабавалі хлеба і разбілі шыбы булачных. З паўднёвай Іспаніі бунтуе жуазія адпраўляе сваіх жонак і дзяцей у Гібралтар (англійская ваенна-морская база).

У Мадрыдзе арыштавана 300 комуністычных і социялістычных рабочых. Арыштован таксама старшыня іспанскай социялістычнай моладзі.

Правыя і фашысцкія арганізацыі сказваюць падтрыманне ўраду Леруса, які працэ падавіць рэвалюцыйны рух. Парламент прыняў прапанову кіраўніка католікаў Рэдэса, якая прадастаўляе права міністру шляхоў зносін прымаць усякія рэпрэсіўныя меры супроць профсаюзаў паштавікоў.

ПА РЭЦЭПТАХ ГІТЛЕРА „УНІФІКАЦЫЯ“ ДРУКУ

ПАРЫЖ, 10 (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Лісабона, католіка-фашысцкі тэрор у Партугаліі прадаўжае лютаваць. Турмы перапоўнены. Палітзняволеных накіроўваюць у канцлагеры.

Усе профсаюзы фашызаваны і знаходзяцца ў руках каталіцкага духавенства. За адмаўленне ад уступлення ў гэтыя саюзы рабочых звальняюць. Рэвалюцыйныя профсаюзы вядуць работу ў падполлі. Арыштаваны ў Сетубале профработнік-металіст Рэхало пад катаваннямі адмовіўся выдаць таварышоў. У чаканні далейшых катаванняў Рэхало, каб не прараніць ні слова, адрэзаў сабе язык.

На германска-фашысцкаму ўзору ўвесь друк «уніфікован». Рэдактары арыштаваны.

ВЫНІКІ XVII З'ЕЗДА ВКП(б) І ЗАДАЧЫ НАСТАЎНІЦТВА

З даклада тав. ГАЛАДЗЕДА на ўсебеларускім з'ездзе настаўнікаў-ударнікаў

У першай частцы свайго дакладу тав. Галадзед спыняецца на значэнні XVII з'езда і асабліва даклада тав. Сталіна.

— Гэты даклад, — кажа тав. Галадзед, — павінен быць настольнай кнігай кожнага настаўніка.

Падагульваючы вынікі барацьбы за сацыялізм, ахарактарызаваўшы вялікія поспехі, якія партыя пад геніяльным кіраўніцтвам тав. Сталіна атрымала ў галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай краіны, паказаўшы манапітасць і моцнасць нашай партыі, спыніўшыся таксама на выступленнях прадстаўнікоў розных былых апазіцый на трыбуне XVII з'езда, тав. Галадзед, падкрэсліваючы галоўныя задачы другой пяцігодкі, зварачае вялікую ўвагу на пытанні арганізацыйнай работы.

Тав. Галадзед гаворыць:

— Пастанова з'езда па арганізацыйных пытаннях—гэта ёсць ключ да ажыццяўлення праграмы другой пяцігодкі.

Таму і тав. Сталін у сваім дакладзе асаблівую ўвагу аддаў арганізацыйнай перабудове нашай работы на ўсіх участках будаўніцтва.

Ён сказаў: высунуць лозунг, вызначыць палітычную лінію — гэта толькі жаданне змагацца, але не сама барацьба. Каб перамагчы, трэба справу арганізаваць, трэба арганізацыйную работу паставіць на ўзровень палітычных задач.

— Я не буду спыняцца падрабязна на арганізацыйнай перабудове нашай работы, бо гэта-б заняло шмат часу. Скажу толькі, таварышы, што задача арганізацыйнай перабудовы нашай работы па-новаму заключаецца ў тым, каб урэшце ажыццявіць лозунг т. Сталіна: «Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць».

Гэта задача датычыць не толькі нас — партыйных ,совецкіх і гаспадарчых работнікаў, але і работнікаў культурнага фронту, у тым ліку і совецкага настаўніцтва (апладысменты).

Першая ўмова, каб па-новаму працаваць і па-новаму кіраваць, каб ажыццявіць задачу партыі — дырэктыву тав. Сталіна (арганізацыйная перабудова работы) заключаецца ў тым, каб асвоіць справу, зразумець яе, аўладаць ёю. Калі чалавек аўладае даручанай справай, тады ён у сілах перабудаваць.

Толькі на падставе ведання справы і поўнага аўладання ёю можна па-новаму перабудаваць. Нельга сказаць, таварышы, каб усе настаўнікі па-большэвіцку аўладалі сваёй справай, я аб гэтым далей скажу. Большасць настаўніцтва — гэта безумоўна майстры сваёй справы, а гэта значыць, што яны ленінскія настаўнікі. Але сярод іх ёсць і такія, якія не падыходзяць не толькі ў настаўнікі, але і ў прылічныя вучні. (Смех, апладысменты).

Вось чаму я і гавару, што задачы, якія ставіць партыя па арганізацыйнай перабудове работы ўсіх звенняў партыйнай, комсамольскай, совецкай, гаспадарчай, профсаюзнай і інш. грамадскіх арганізацый, датычаць і настаўніцтва.

Я лічу, што настаўніцтва павінна зразумець гэта. Настаўніцтва павінна пачаць працаваць па-новаму на гэтым з'ездзе і павінна пачаць працаваць па-новаму пасля з'езда ў школе.

Дазвольце мне перайсці да гэтых канкрэтных пытанняў.

Палітэхнізацыю школ—у цэнтр увагі

XVII з'езд партыі вызначыў асноўныя пытанні сацыялістычнага будаўніцтва і адкрыў новую старонку ў развіцці сацыялістычнай раволюцыі, адкрыў новую эпоху, якая набліжае нас шчыльна да бясклasавага сацыялістычнага грамадства. Пастановы XVII з'езда — гэта пастановы, якія паказваюць, як заваяваць усе пазіцыі сацыялізма, канчаткова ліквідаваць капіталістычныя элементы і перажыткі капіталізма. Якія канкрэтныя задачы стаяць перад настаўнікамі на фоне гэтых грандыёзных перспектыў?

Ленін часта ўказваў на тое, што фронт навукі з'яўляецца важнейшым фронтам. Таму рашэнні з'езда партыі трэба не толькі прачытаць, а вы вучыць, каб не дапускаць у сацыялістычнай школе такіх казусаў, за якія прыходзіцца чырванець не толькі настаўніцтву, але і любому совецкаму грамадзяніну. Народная асвета заўсёды была ў цэнтры ўвагі нашай большэвіцкай партыі. Мы не глядзелі на яе, як на нешта дапаможнае, бо асвета з'яўляецца галоўнейшым інструментам, дапамагаючым замацоўваць пролетарскую дыктатуру, дапамагаючым сапраўды па-новаму кіраваць пролетарскай дзяржавай і ўсім ходам сацыялістычнай рэволюцыі.

Таму не раз Ленін і Сталін падкрэслівалі важнасць участка народнай асветы. Таму не раз наша партыя ставіла і ажыццяўляла задачу — набудаваць самую сістэму народнай асветы на такіх прынцыпах, якія-б выхоўвалі новага чалавека, новага будаўніка сацыялізма. Іменна на гэтых прынцыпах набудавана наша адзіная працоўная школа, політэхнічная школа.

Як працуе гэта політэхнічная школа, ці захоўвае яна на практыцы ўсе прынцыпы марксізма-ленінізма? Аб гэтым давайце сёння і пагаворым на нашым з'ездзе.

Трэба сказаць, што мы на гэтым шляху маем шмат дасягненняў. Нельга думаць, што ў нас у рабоце школ ёсць толькі прарывы. У нас ёсць бліскучыя ўзоры работы як у справе народнай асветы, так і ў справе політэхнізацыі школ. Разам з велізарнымі перамогамі народнай гаспадаркі мы маем гігантскія поспехі ў справе народнай асветы, у тым ліку і ў БССР. Напрыклад, у БССР было больш чым у іншых рэспубліках няграматных, у БССР найменшы процант дзяцей наведвалі школы і вучыліся. Зараз мы ў ліку першых рэспублік Саюза па народнай асвеце.

У 1914 г. на Беларусі навучалася ў школе ўсяго 27 проц. дзяцей, у абсалютных лічбах — 273 тыс. дзяцей; у 1928 г. — 50 проц. — 478 тысяч; у 1931 г. — 75 проц. — 690 тыс., а ў 1933-1934 навучальным годзе мы маем ахоп школамі каля 97 проц. дзяцей, або 900 тысяч. Такім чынам, вы бачыце, мы выраслі па ахопу дзяцей школай з 27 проц. да 97 проц., а ў абсалютных лічбах—з 270 тыс. да 900 тысяч.

І мы зараз павінны канстатаваць, што БССР — гэта найбольш забітая, адсталая ў мінулым краіна, — у выніку правільнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, у выніку агульных поспехаў, якія мае Совецкі Саюз, і на падставе гэтых поспехаў стала перадавой рэспублікай на культурным фронце (апладысменты).

Тав. Сталін яшчэ ў 1925 г. сказаў, гаворачы са студэнтамі:

«Што датычыць мерапрыемстваў па забеспячэнню змычкі ў галіне культурна-асветнай работы, аб гэтых мерапрыемствах мала прыдзецца сказаць, бо гэтыя мерапрыемствы ясны, агульнавядомы, а таму не патрабуюць растлумачэння. Я-б хацеў толькі вызначыць асноўную лінію работы ў гэтай галіне на бліжэйшы перыяд. Яна, гэта асноўная лінія, заключаецца ў тым, каб падрыхтаваць умовы, неабходныя для ажыццяўлення агульнай абавязковай пачатковай асветы ва ўсёй краіне, па ўсяму Саюзу. Гэта, таварышы, буйнейшая рэформа. Правядзенне яе будзе велізарнейшай перамогай не толькі на культурным, але і на палітычным і на гаспадарчым франтах. Яна, гэта рэформа, павінна паслужыць базай для найвялікшага ўздыму краіны, але яна будзе каштаваць сотні мільёнаў рублёў.

Даволі ўказаць на тое, што яна патрабуе для свайго ажыццяўлення цэльнай армії, амаль што поўмільёна настаўнікаў і настаўніц, але мы павінны, не гледзячы ні на што, гэту рэформу забяспечыць у бліжэйшы перыяд, калі мы сапраўды думаем падняць краіну на высокую ступень культурнасці, і мы зробім гэта, таварышы, у гэтым не можа быць сумнення».

Так ставіў пытанне аб народнай асвеце, аб усеагульным навучанні тав. Сталін яшчэ ў 1925 годзе, а ў 1934 г., сёння, мы можам сказаць, што гэта абяцанне тав. Сталіна на 100 проц. ажыццёўлена (апладысменты).

Я сказаў, што ў нас не ўсюды праца з політэхнізацыяй у парадку. Вы на сваім настаўніцкім з'ездзе гэта пытанне павінны выцягнуць, разгарнуць у поўным аб'ёме, абгаварыць у дробнейшых дэталях, бо задача політэхнізацыі школы ,а значыць і выхавання дзяцей на прынцыпах політэхнізацыі ,гэта задача карэнная ў народнай асвеце.

Яшчэ Энгельс у «Антыдзюрынгу» пісаў, што ў социялістычным грамадстве праца і выхаванне будуць аб'яднаны і для гэтага неабходна забяспечыць падрастаючым пакаленням усебаковую тэхнічную асвету.

Ленін таксама ставіў пытанне, што «Нельга сабе ўявіць ідэал будучага грамадства без злучэння навучання з прадукцыйнай працай маладога пакалення; ні навучанне і асвета без прадукцыйнай працы, ні прадукцыйная праца без паралельнага навучання і асветы не магілі-б быць пастаўлены на тую вышыню, якая патрабуецца сучасным узроўнем тэхнікі і станам навуковых ведаў. Для таго, каб злучыць усеагульную прадукцыйную працу з усеагульным навучаннем, неабходна, відавочна, ускласці на ўсіх абавязак прымаць удзел у прадукцыйнай працы».

Вельмі моцна наша партыя паставіла пытанне політэхнізацыі школы і наладжання работы школ наогул.

Што мы ў БССР маем у галіне політэхнізацыі школы? Я павінен адзначыць на вашым з'ездзе, што ўмовы для настаўніцтва з пункту гледжання прыкладаў паказальнай пастаноўкі мы сякія-такія стварылі. Мы стварылі добрую тэхнічную дзіцячую станцыю, дзе сканцэнтраваны ўсякага роду прылады, на іх могуць настаўнікі вучыцца, браць прыклады, укараняць іх сабе ў школе.

Бясспрэчна, што гэта станцыя ў політэхнізацыі займае сур'ёзнае месца. Шмат фактаў сведчаць аб тым, што ўжо гэта дзіцячая тэхнічная станцыя з'яўляецца вялікім дапаможнікам для ініцыятыўных, зразумела, настаўнікаў у сэнсе пастаноўкі політэхнічнай асветы ў сваёй школе. Даволі напомніць, што аб гэтай станцыі ведаюць далёка за межамі БССР.

Я вам прыведу для прыкладу адно пісьмо вучня з Уральскай вобласці. Ён піша наступнае:

«Прашу цэнтральную дзіцячую станцыю прыслаць мне парадку, як самому пабудаваць фота-апарат. Я вельмі зацікаўлен у гэтай справе. Я ўжо па вашай парадзе, якая была змешчана ў «Піонеры Беларусі»—як пабудаваць дэтэктарны прыёмнік — па будаваў апошні і добра слухаю Маскву, Ленінград і інш. станцыі. Зараз маю вялікае жаданне пабудаваць фота-апарат. Прашу вашых указанняў.

Вучань 7-й Езерскай ФЗС. Адрас: Уральская вобласць, станцыя Турынск. Табарынскі раён. с.-с. с.-п. Озерскі, Сакалоўскаму Станіславу Ст.».

Значыць, прыклады політэхнізацыі ёсць. Ці выкарыстоўваецца гэты паказальны ўчастак для таго, каб укараніць прынцыпы політэхнізацыі ва ўсе нашы школы 1-й і 2-й ступені? Я гэтага не сказаў-бы.

Таварышы, гэта пісьмо вучня гаворыць аб тым, што сёння наш вучань совецкай школы рвецца да тэхнікі.

Яшчэ ў 1923 г. Владзімір Ільіч гаварыў, што 99 проц. працоўных зразумелі значэнне народнай асветы, цягнуцца да гэтай асветы. І мы павінны рабіць усё для таго, каб гэту асвету шырокім масам працоўных даць. Ленін, далей, гаварыў, што мы гэта зробім таму, што за справу кіраўніцтва дзяржавай узяліся самі працоўныя масы, — значыць, яны і аўладаюць фронтам асветы.

Вось гэтыя словы мы можам аднесці і да сённяшняга перыяда і сказаць: сёння 99 проц. працоўных мас цягнуцца да тэхнікі ,жадаюць аўладаць гэтай тэхнікай, яны нутром адчуваюць неабходнасць аб'яднаць агульную асвету з тэхнікай.

Адсюль задача настаўніцтва па політэхнізацыі школы як ніколі вострая і вельмі важная. Адсюль задача настаўніцтва па політэхнізацыі школы як ніколі адказная, бо ўсе нашы дзеці сёння імкнуцца не адстаць ад свайго старшага пакалення. І калі старшае пакаленне на заводзе, на фабрыцы, на шахце, на любым прадпрыемстве змагаецца за тэхніку, то і дзеці ў школе жадаюць весці барацьбу за тэхніку, жадаюць не толькі слухаць радыё, але і зрабіць радыёпрыёмнік, жадаюць не толькі быць фатаграфаванымі, але і самім зрабіць фотаапарат, і ўсе магчымасці для гэтага мы павінны даваць дзецям.

Таму задача політэхнізацыі вырасла ва ўвесь свой рост. Задача з'езду настаўнікаў заключаецца ў тым, каб гэта пытанне, асноўнае для работы совецкай прапоўнай школы, разгарнуць ва ўсіх дэталях, правесці, што зроблена зараз, што недароблена, дзе трэба напісаць.

За высокую якасць вучобы

ЦК ВКП(б) даўно паставіў пытанне аб нізэйшай і сярэдняй школе і запісаў у пастанове, што «навучанне ў школе не дае дастаткова аб'ёму агульна-асветных ведаў і недавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і вышэйшай школы ў поўнай меры граматных людзей, добра ўладаючых асновамі навукі (фізіка, хімія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.)». Так ацэніўшы становішча школ, ЦК ВКП(б) у вядомай пастанове ўсклаў абавязак на ўсіх нас, у першую чаргу на совецкае настаўніцтва, дабіцца паляпшэння працы школы. Вось на з'ездзе давайце адкажам на запытанне, як-жа ў нас справа выпраўлялася, ці выпускаем мы са школы вучняў, якія, паступаючы ў тэхнікум або вышэйшую навучальную ўстанову, добра знаёмы і ўладалі асновамі навукі фізікі, хімі, матэматыкі, роднай мовы, геаграфіі і т. д.? Я павінен прама сказаць, што не ўсе мы можам пахваліцца тым, што з нашых школ выходзяць такія людзі, аб якіх пішацца ў пастановах ЦК ВКП(б). А гэта значыць, што не ўсе школы працуюць як трэба, што не ва ўсіх школах работа пастаўлена на належную вышыню.

Вядома, што нельга ўсё ахапіць, нельга думаць, што ў нас усе школы толькі дрэнныя. У нас ёсць вельмі добрыя, узорныя школы, і не толькі ў Менску, пад боскам Наркамасветы, але і ў раёнах мы маем прыкладныя ўзоры работы. Але ў нас ёсць і школы, якія выглядаюць не па-совецку, некультурна. Прывяду прыклады добрай работы асобных школ.

Напрыклад, у крупскай узорнай школе калгаснай моладзі мы можам канстатаваць вельмі добрую паспяховасць. За першае паўгоддзе сярод 94 проц. вучняў вельмі добрая паспяховасць вучобы, праведзена вялікая работа на барацьбе за чысты і граматны спытак, у школе сярод вучняў адчуваецца дысцыпліна, пры чым дысцыпліна не паказная, а свядомая; ёсць літаратурны гурток, дзе ці вельмі зацікаўлены літаратурай. За якасць вучобы змагаецца ўвесь настаўніцкі калектыў. Асабліва актыўна і добра працуе, арганізуе ўвесь калектыў настаўнікаў і б'ецца за паляпшэнне якасці вучобы загачык гэтай школы тав. Стрэльченка.

Гэту школу мы можам аднесці ў разрад добрых, прыкладных школ.

Потым Лагуцінская дзвёхкамплектная школа, Ельскага раёна, дзе таксама выкладанне настаўнікам як у сапраўднай совецкай школе. Тав. Тамашук, загадчык Лагуцінскай школы, мае звыш 30 год настаўніцкага стажу, усе дзеці ў яго ведаюць матэматыку на «вельмі добра». Гаворыцца, і менш здольныя і больш здольныя—усе ідуць паспяхова. Гэта, як бачыце, залежыць ад настаўніка.

Яшчэ заслугоўвае быць адзначанай, як узорная, школа калгаснай моладзі ў Жыткавічах. Увесь настаўніцкі калектыў згуртован і аддае школе ўвесь час; таму гэта школа мае значныя дасягненні ў навучальна-выхаваўчых працэсах. Выключная дысцыплінаванасць дзяцей, зацікаўленасць вучобай, шчыльная сувязь школы з бацькамі, з боку настаўніцтва вядзецца настойлівая сістэматычная работа па педагагічнай прапагандзе сярод насельніцтва, сярод бацькоў вучняў і інш. колаў насельніцтва. У жыткавіцкай школе добра наладжана піонерская і па-за-школьная работа. Гэта сведчыць аб тым, што ў данай школе настаўнікі на сваім месцы—сапраўды совецкія настаўнікі, якім можна даверыць выхаванне новага пакалення.

Я прывёў вам некалькі прыкладаў добрай работы школ. Такіх прыкладаў у нас шмат, сотні і больш, але сярод гэтых узорных прыкладаў работы школ ёсць і вельмі чорныя плямы, прычым калі разбярэцца: чым-жа растлумачыць, што ў адной школе і спыткі ёсць, і яны ў парадку, чыстыя, почаркі ў дзяцей чоткія, памылак мала, матэматыку і іншыя дысцыпліны добра ведаюць, а ў другіх школах такія-ж умовы, а спыткаў няма або яны запэцканы, і дзеці дрэнна вучацца, і дысцыпліны няма,—то аказваецца, што справа залежыць ад людзей, ад настаўнікаў, ад тых, хто выхоўвае і арганізуе дзяцей. Толькі ад іх і больш ні ад кага.

Вось прыклады школ другога парадку, дзе работа пастаўлена дрэнна.

Талачынскі раён, Спаўненская фабрычна-заводская сямігодка. Там замест добрай вучобы, замест добра пастаўленай піонерскай работы і грамадскай пазашкольнай работы, школа (вярней некаторыя настаўнікі гэтай школы) выхавала антысовецкую чорнасоценную арганізацыю ў складзе 6 вучняў. Гэта арганізацыя разграміла бібліятэку яўрэйскай школы, на сценах школы напісаны пагромныя антысовецкія лозунгі.

У Круглянскай школе, таго-ж раёна, настаўніцкі калектыў засмечан класава-варожымі элементамі, праўда, зараз крыху пачысцілі. Ніякай выхаваўчай работы сярод дзяцей у гэтай школе не вядзецца, адсутнічае штодзённая сувязь з імі, зацікаўленасць іх жыццём. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў школе меў месца выпадак самагубства вучня сёмай групы.

Дрысенскі прымежны раён. Там, як быццам, усё павінна быць паказальным, а на справе загадчык школы і асобныя настаўнікі арганізуюць цкаванне вучня другой групы—сына нам. начальніка політаддзела МТС. Выдумляюць антысовецкія частушкі.

Пры абследванні гэтай школы выявілася, што ні адзін вучань не мае ўяўлення аб тым, што такое політаддзелы МТС і соўгасаў. Як можна дапусціць, каб вучні сямігодкі не ведалі, што значыць політаддзелы МТС і соўгасаў. Політаддзелы—гэта-ж асноўныя політычныя органы нашай партыі ў вёсцы на наладжанню сельска-гаспадарчай калгаснай вытворчасці, праз якія партыя канкрэтна кіруе справай узмацнення калгасаў, узмацнення новага калгаснага ладу ў вёсцы. Арганізуючы політаддзелы, партыя правяла выключную прарэлівасць, і практыка паказала ўжо, што політаддзелы ёсць вярнейшы сродак наладжання калгаснай вытворчасці, уваходжання партыі ў самыя дэталі гэтай вытворчасці, у самае асяродзішча калгаснікаў, арганізацыі гэтых калгаснікаў, ператварэння іх у сапраўды свядомых і актыўных творцаў соцыялізма. І вось аб гэтых політаддзелах вучні не ведаюць, нават больш таго—антысовецкія частушкі складаюцца аб дзеях начальнікаў політаддзелаў. Значыць, мы справу маем там не з совецкімі настаўнікамі, а, відаць, з людзьмі нам чужымі, варожымі.

Цяпер возьмем яшчэ Жыткавіцкі раён. Там загадчык Юрэвіцкай школы калгаснай моладзі Ліс праяўляе антысемітызм, яўна ігнаруючы, што мяжуе з праследваннем, настаўніцуяўрэйку. Ён прымяняе нямецкі «метад» выхавання дзяцей, гэта значыць выхаванне дзяцей пабоямі. Кажуць, што ў фашысцкай Германіі ёсць яшчэ такая тэорыя, што без біцця дзяцей не навучыш. І вось настаўнік Ліс таксама ўплывае на вучняў ударамі або па шыі, або па руках.

А настаўніца гэтай школы Напівайка зусім бяздзейнічае. Яна часта і на працу не з'яўляецца.

Кажуць, што яны зараз з працы заняты. Баюся, што яны паціхеньку пройдуць у другое месца, у другія раёны і ў лік ударнікаў пападуць (смех).

На жаль, вось тут, пад бокам у нас, у Менскім раёне і нават у самым Менску побач з добрай работай раду школ ёсць дрэнныя ўзоры работы, якія паказваюць, як не трэба дзяцей вучыць.

Я ўказаў, што гэта ўсё залежыць ад людзей, залежыць ад настаўнікаў. І сапраўды, як такі настаўнік можа добра вучыць людзей, добра ставіць работу ў сваёй школе, аб якім група дзяцей вучняў Бягомльскага раёна піша наступнае:

«Настаўнікам Атрубскай школы, Асоўскага сельсовета, з'яўляецца Сцяпан Куазура. Па нашай думцы гэты чалавек ніколі ні не адпавядае свайму прызначэнню. Гэта не цяжка даказаць. Звычайна Куазура ў часе заняткаў кідае вучняў, збірае выпадковых людзей і вядзе з імі гутаркі. Праўда, часцей за ўсё Куазура забіраецца на печ і не пакідае яе да канца так званых «заняткаў».

З печы Куазура вучыць вучняў і граматыцы, і арыфметыцы, і матэматыцы, і мове. Аб якасці гэтага «вучэння» няма чаго і гаварыць.

У дні калад усе вучні з'явіліся на заняткі, але не з'явіўся той, хто першым павінен выступаць супроць рэлігійнага свята. Не з'явіўся сам настаўнік Куазура. У школе няма амаль ні аднаго вучня, якому-б Куазура не даў сваёй мянушкі. Ён звычайна вучняў называе так: кулацкі тып, дубіна, лепятуха, вэцка, пень і т. д.

Сорамна мець нам такога настаўніка. Просім адпаведныя органы даць у нашу совецкую школу сапраўднага совецкага настаўніка».

Вось як пішуць дзеці аб сваім настаўніку ў газету Бягомльскага раёна.

Аказваецца, у нашай совецкай школе ёсць яшчэ такія настаўнікі. І ўся штука ў тым, што, па-першае, Наркамасветы аб гэтым не ведае. Па-другое, райАНА аб гэтым таксама не ведае, і, па-трэцяе, калектыў настаўнікаў Бягомльскага раёна напэўна аб гэтым ведае, але церпіць. Нельга дапусціць думкі аб тым, каб іншыя настаўнікі Бягомльскага раёна не ведалі аб гэтым. Я ведаю жыццё вёскі. Бывае так, што ад сяла да сяла 15-20 клм. і ўсё-ж такі часта Маланья з адной вёскі ведае, што ў другім сяле ў Грыпіны ў гаршку варыцца (смех). Думаю, што настаўнікі раёна ведаюць аб «працы» Куазуры, але церпяць такіх людзей.

Сур'ёзнейшы недахоп — гэта палітычная бязграматнасць раду настаўнікаў. Вось тут, у менскіх школах, наколькі мне вядома, у сямігодках прапрацоўваць даклад тав. Сталіна і рашэнні XVII з'езда. Гэта добра, правільна, бо зараз нават дзеці, калі яны самімі бацькамі не сапсаваны, яны ўжо з 2-3 групы пачынаюць жыць грамадскім жыццём. Дзеці цікавяцца ўсім, і нельга мысліць зараз выхаванне дзяцей ,не ўцягваючы іх у грамадска-палітычнае жыццё. Гэтага не можа быць.

Значыцца, ад настаўніка патрабуецца веданне палітычнага жыцця нашай краіны, веданне асноў нашага ладу. Настаўнікам трэба абавязкова быць хоць крыху палітычна падкаванымі. Без гэтага настаўнік ці настаўніца дзіцяці нічога не дасць, не выхавае з дзіцяці свядомага совецкага грамадзяніна, бо на ўсякае з'явішча дзіця рэагуе, і задача настаўніка ці настаўніцы абавязкова заўсёды талкова растлумачыць дзіцяці тое, чым яно цікавіцца. Калі настаўнік ці настаўніца не растлумачаць, дзіця ідзе назад, яно не расце, яно прытыгваецца. Інакш дзіця можа выйсці добрым матэматыкам, але ў палітычным жыцці можа аказацца зусім няграматным.

Цяпер вучань павінен адначасова з аўладаннем хіміяй, фізікай, матэматыкай, літаратурай і інш. дысцыплінамі, аўладаць і пытаннямі грамадска-палітычнага жыцця. Гэта велізарнейшая задача. Адсюль аграмадная адказнасць ляжыць на настаўніцтве — ведаць гэту справу, справу грамадска-палітычнага выхавання дзяцей.

Вось, напрыклад, як прапрацоўваецца даклад тав. Сталіна і пастановы XVII з'езда ў многіх школах. У некаторых школах бязлітасна скажаюць даклад тав. Сталіна. Гэта гаворыць аб тым, што там настаўнікі няграматныя, самі дрэнна разбіраюцца нават у тым, што прачыталі.

Ну, як-жа растлумачыць такі настаўнік, як, скажам, настаўніца Шы фрыма з Буда-Кашалёўскага раёна. Яна захацела паступіць у Гомельскі педінстытут, каб крыху перападрыхтаваць сябе. Добрая справа, добрае жаданне. Мы ўсямерна падтрымліваем справу кваліфікацыі настаўніцтва.

Пры праверцы яе ведаў у прыёмнай камісіі інстытута ёй задаюць пытанне: «Які працэс праходзіў у апошні час у Германіі?» Адказвае: «Чула ,што кагосці судзілі (смех), але не разабрала каго і за што (смех).

Ёй задаюць другое пытанне: «Што такое Комінтэрн?»

Адказвае: «Аб'яднанне ўсіх нацый» (смех). Далей вось пытанне: «Расшыфруйце слова «Комінтэрн» поўнасцю. Яна гаворыць: «Гэта камітэт па народнай асвеце» (смех).

Далей пытанне:«Хто ўваходзіць у склад Комінтэрна?»

Адказвае: «У склад Комінтэрна ўваходзіць народны камісарыят асветы і ЦК ВКП(б)» (смех).

Таварышы, на вялікі жаль, гэта не анекдот, а сапраўднасць, сумная сапраўднасць. Гэта адказвае настаўніца, якая рад гадоў навучала дзяцей. Спытайцеся вы ў любога вучня 4-й, 5-й, нават 3-й групы — што за працэс быў у Германіі, і вам усе вучні любой школы, а калі не ўсе, то за 90 проц. я ручаюся, раскажуць аб гэтым. Во ўвесь-жа свет, а наша краіна асабліва сачылі за гэтым працэсам. Гэта-ж была схватка фашызма з комунізмам і комунізм перамог. Дзімітраў адстаяў сцяг комунізма і выкрыў правакацыі фашызма. Дзеці ведаюць аб гэтым, а настаўніца, бачыце, «чула, што кагосці судзілі, але не разабрала, каго і за што».

Яшчэ адзін факт. Экзаменуецца «парттысячнік» (гэта я асабліва падкрэсліваю), інспектар па дашкольнаму выхаванню Веткаўскага раёна Паўленкаў пры паступленні на перападрыхтоўчыя курсы ў гэты-ж гомельскі педінстытут. Ён дае такія адказы на запытанні.

Пытанне: «Што за вайна была ў 1914-18 г.г.?»

Адказ: «Гэта была грамадзянская вайна» (смех).

Пытанне: «Якую ролю адыграла наша партыя ў гэтай вайне?»

Адказ: «Не ведаю» (а гэта-ж комуніст, член партыі, парттысячнік).

Пытанне: «Колькі часу прайшло ад Лютаўскай да Окцябрскай рэволюцыі?»

Адказ: «8 дзён» (смех).

Пытанне: «Хто кіруе ў нас усім будаўніцтвам?»

Адказ: «З'езд советаў».

Пытанне «Як даўно існуе «Комінтэрн?»

Адказ: «З 1861 года» (смех).

Гэта, таварышы, інспектар, комуніст, і гэтаму чалавеку даверана інспектаваць як выхоўваюцца дзеці.

А вось адзін студэнт гомельскага педагагічнага інстытута на прозвішчу Гельгоф на пытанне — хто такі Сталін, адказвае: старшыня ВСНГ (смех).

Чаму старшыня ВСНГ — гэта адному студэнту вядома.

Гэта недапушчальная рэч, гэта-ж проста ганьба для настаўніка. Возьміце зараз двухгадовае дзіцё, разгарніце перад ім любую кнігу, дзе ёсць партрэт Сталіна, яно ткне пальцам і скажа—Сталін. Хто такі Сталін—аб гэтым ведаюць індыйскі рабочы, кітайскі кулі, афрыканскія надніво леныя рабы, працоўныя ўсяго свету, а студэнт гомельскага педагагічнага інстытута Гельгоф думаў, што Сталін—гэта старшыня ВСНГ. Тав. Сталін з'яўляецца сцягам пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце, сцягам барацьбы за социялізм ў нашай краіне. Пад сцягам Сталіна арганізоўваюцца і ідуць на барацьбу мільёны прыгнечаных ва ўсім свеце. А вось студэнту совецкай ВНУ «не патрэбна» гэтага ведаць. Вось палітычны твар адзяльных асоб, якія, на жаль, бяруцца выхоўваць наша маладое пакаленне.

Нельга вядома, разумець так, што прыведзеныя факты характарызуюць усё наша беларускае совецкае настаўніцтва, ніба ўсё сучаснае настаўніцтва нашых ВНУ. Зусім не, гэта толькі некаторыя асобы ў нас яшчэ застралі, і твар іх намі яшчэ не выяўлен, або яны па непаразуменню з'яўляюцца настаўнікамі і студэнтамі нашых ВНУ. Наша настаўніцтва ў сваёй масе зусім іншае: культурнае, палітычна падкованае і зусім сумленна, з веданнем сваёй справы, працуе над выхаваннем дзяцей, працуе над сабой. Але ёсць адзінкі сярод іх, якія не годны быць настаўнікамі. Лепш без гэтых студэнтаў, лепш без гэтых настаўнікаў. Трэба нам прадаваць па-совецку, сур'ёзна.

За высокую культуру

Сярод нашых настаўнікаў, на жаль, ёсць яшчэ людзі зусім граматычна непісьменныя. Я вам пачытаю арыгінал аднаго пратакола, напісанага настаўнікам. Можаце самі яго паглядзець, я вам яго пакіну.

Настаўнік, да якога ў вёсны зварачаюцца як да граматнага чалавека і просяць напісаць пастанову сельсовета, вось як яе піша.

«Пастанова прызідюма Кошчынскага селсовета. Просім прызыдюм раённага іспалнітільнага Камітэта і прадстаўніка ЦК аб зняцці з чорнай дошкі Вёскі Стаўбцы якая павінна быць выканана ўсіх відаў загатовак у разрэзе кожнага двара на 100 проц. з поўнай засыпкай страх фонда».

Калі-б так напісаў вучань любой групы, то гэта таксама было-б кепска, сорамна таму настаўніку, вучні якога так пішуць, але-ж гэта, на жаль, піша настаўнік. Як такі настаўнік можа вучыць сваіх вучняў?

Наша партыя заўсёды стаяла, стаіць і будзе стаяць за сур'ёзную граматнасць, за высокую культуру, за яўладанне культурай і граматай. Мы заўсёды змагаліся з няграмотнасцю. Нельга такім людзям даручаць выхаванне дзяцей.

Думаю, што і сярод настаўнікаў, якія тут прысутнічаюць, таксама знойдуцца такія людзі, якія не малі шчасця вучыцца ў сярэдняй і ў вышэйшай школе, а скончылі толькі земскую школу 16-18 год таму назад. Але-ж мы на рабоце, незалежна ад таго, хто дзе працуе, імкнемся аўладаць граматнасцю і асновамі культуры. Мы вучымся ў самога жыцця, на практыцы, імкнемся аўладаць граматай, каб быць граматнымі людзьмі. Гэта павінна з'яўляцца задачай кожнага працоўнага. Калі немагчыма набыць граматнасць праз школу, ВНУ, то трэба вучыцца самому, вучыцца на практыцы, у жыцці. А настаўніку гэта абавязкова неабходна.

Аб беларускім правапісе

Вось я прачытаў гэту самую пастанову, напісаную настаўнікам, якую мне прыслалі і ў мяне з'явілася думка: як-жа гэты чалавек праводзіць у жыццё рэформу беларускага правапіса?

Мы распрацавалі новы правапіс, зрабілі, калі хочаце, цэлую рэволюцыю ў беларускім правапісе. Мы вельмі многа працавалі над рэформай беларускага правапіса, вытравілі з яго ўсё непатрэбнае, надземаўскае, варожае, спрасцілі беларускі правапіс, аблягчылі задачу навучання граматнасці дзяцей, дарослых, каб менш было зуброжкі, палажылі ў аснову новага беларускага правапіса прынцып пролетарскага інтэрнацыяналізма, каб дзеці, пачынаючы вучыцца з правапіса, ужо выхоўваліся ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма. Значна вытравілі старажытныя архаізмы, вульгарызмы, якія ўнесены былі ў беларускі правапіс Ластоўскім, Лёсікам, Некрашэвічам і інш. з часоў Францыскі Скарыны. Асноўныя змены і спрашчэнні беларускага правапіса запісалі ў дэкрэце СНК БССР.

Нашы класавыя ворагі за граніцай —Луцкевічы, Астроўскія, Станкевічы—зразумелі палітычную сутнасць гэтага дэкрэта аб рэформе правапіса, паднялі шалёнае выццё, узялі дэкрэт Соўнаркома ў штыхі. Усе іх газеты з нумара ў нумар атакуюць дэкрэт СНК аб правапісе, называючы гэты дэкрэт другім рыжскім дагаворам, які нібыта дзеліць Беларусь напалам. Яны ўзялі ў штыхі гэты новы правапіс.

Значыць, класавы вораг разумеў, куды накіроўваецца дэкрэтам вострасць пролетарскай барацьбы, ён зразумеў, што мы выбіраем яго з агульных пазіцый—з філалагічнага фронту, імкнецца ўхапіцца за гэтыя пазіцыі. А нашы асобныя настаўнікі не разумеюць, што такое беларускі правапіс, што яно павінны вучыць нават і настаўнікі. Інакш які-ж ён настаўнік, як-жа ён будзе гэты правапіс ажыццяўляць.

Таварышы, мы на з'ездзе павінны будзеце грунтоўна правяраваць пытанне падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў і ў галіне політычнай і педагагічнай. Сур'ёзна падумаць аб арганізацыі завочнага навучання, падумаць аб рабоце над сабой, бо роля настаўніка вельмі вялікая, яна заключаецца ў тым, што гэты чалавек павінен выхоўваць новае пакаленне дзяцей.

Таму мы прынялі гэтымі днямі на станову СНК па правапісе тав. Чарнушэвіча аб абавязковым праходжанні па-заашкольнага навучання тымі настаўнікамі, якія не маюць сярэдняй і вышэйшай асветы. У РСФСР гэта ўжо праведзена. Я думаю, што і ў нас гэта трэба правесці. У парадку совецкага дэкрэта трэба будзе абавязаць тых настаўнікаў, якія не маюць сярэдняй і вышэйшай педагагічнай асветы, абавязкова падвучыцца, узяць свае веды. Гэта патрэбна, як паветра, інакш чалавек адстане ад жыцця.

Аб дысцыпліне

Яшчэ адна заўвага, таварышы. Гэта аб дысцыпліне ў школе. Апрача таго, каб дзіцяці даць неабходныя веды ў школе, трэба зрабіць арганізаваным чалавекам. Та му я пытанне дысцыпліны стаўлю інакш: не дысцыпліна дзеля дысцыпліны, а дысцыпліна для арганізацыі чалавека. Гэта абавязковая задача, прычым я асабіста на практыцы пераканаўся, што гэта частка задачы—выхаванне арганізаванага, дысцыплінаванага чалавека—вельмі адказная і, па-моему, бадай самая важная, якая ляжыць на настаўніку. Дысцыпліна ў вучобе, дысцыпліна ў часе дапаможа дзецям прадукцыйна скарыста

Працяг даклада тав. М. М. Галадзеда

...ка, якая гарантуе і класавую пільнасць і арганізатарскую здольнасць. Вы памятаеце, калі мы прынялі першую пяцігодку, партыя зрабіла праверку сваіх радоў, падагнула свае рады і рушыла ў дарогу арганізаванымі, дысцыплінаванымі радамі на барацьбу за выкананне першай пяцігодкі. На рубяжы другой пяцігодкі мы гэта такі робім. Чаму падкрэсліваем і партыйную і савецкую дысцыпліну? Быць дысцыплінаваным, арганізаваным — гэта значыць быць і моцным будаўніком.

Дзяцей трэба рыхтаваць у такім ...ка духу. Таму дрэнны той настаўнік, у якога няма дысцыпліны ў школе, у якога дзеці не акуратныя, у якога ў школе ёсць выпадкі хуліганства. Дрэнны той настаўнік, якога не слухаюць дзеці. Дзяцей трэба вучыць, зрабіць з дзяцей новых людзей, арганізаваных, культурных, акуратных, чыстаплотных. Я гэта стаўлю на першае месца сярод іншых абавязкаў настаўніка, бо калі вы сфармуеце арганізаванага, сапраўды дысцыплінаванага, а значыць уладарчага сабой чалавека, яму лягчэй аўладаць і хіміяй, і матэматыкай, чым хочаце, бо чалавек будзе сам сабой упраўляць, ён будзе адначасова і больш прадпрымчывы і ініцыятыўны. Пакуль вы гэтага яму не прывіце, вы будзеце навучаць недысцыплінаваных, не прадпрымчывых людзей і веды ў іх не будуць замацоўвацца як след.

Ці ва ўсіх школах у нас ёсць дысцыпліна? Не ва ўсіх. Ёсць узорныя школы, ёсць і дрэнныя. Ёсць школы, куды дзеці прыходзяць з хуліганскімі нахіламі, а пабыўшы там, праз нейкі час становяцца прыкладам для другіх дзяцей. Ёсць і такія школы, дзе дзеці, добра выхаваныя, ператвараюцца ў хуліганаў, разпагаюцца. Такіх выпадкаў колькі хочаце, гэта залежыць ад людзей. У адной узорнай школе настаўнікі і настаўніцы не толькі добрыя педагогі, але і педагогі-арганізатары. Там элементы хуліганскага нахілу дзяцей улятучваюцца, вучань робіцца арганізаваным. У другой — дрэнная школе, дзе слабыя арганізатары настаўнікі, там і добрыя дзеці становяцца дрэннымі.

Вышэй класавую пільнасць

Апошняя заўвага. Школа з'яўляецца адным з участкаў самай жорсткай класавай барацьбы. Клясавая барацьба, якая абдываецца ў ...не, захватвае школу і безумоўна не можа не захваціць яе. Бо ўвесь ідэалагічны фронт, у тым ліку і школа — гэта той участак, на які класава-варожыя элементы, а ва ўмовах БССР кулацка-нацыяналістычныя, контррэволюцыйныя элементы, накіроўвалі свае галоўныя сілы, бо яны шукалі тут людзей, на якіх можна было апіраца. Яны імкнуліся прывіць сваю нацдэмаўскую ідэалогію моладзі, дзецям. Астаткі класава-варожых элементаў не адмаўляюцца і не адмовяцца ад барацьбы з савецкай уладай. Яны бралі стаўку і не адмовіліся ад яе на тое, каб адарваць моладзь пакаленне і выхаваць яго ў духу нацыянал-дэмакратызма, супроць савецкай улады. Як абстаяла справа з настаўнікамі ў нашых школах? Тут, таварышы, трэба сказаць, што буржуазныя нацыяналісты і раней і цяпер не знайшлі сабе апоры сярод асноўных мас настаўніцтва. Савецкае настаўніцтва ў сваёй масе давала і дае зараз рашучы адпор прошукам нацыяналістаў, але сярод настаўніцтва знаходзіліся і такія асобныя людзі (яны і зараз яшчэ ёсць), якія падтрымліваюць нацыяналістаў і самі з'яўляюцца нацыяналістамі. Ёсць яшчэ сярод настаўнікаў не нашы людзі.

Рады настаўніцтва БССР значна ўмацаваліся, падцягнуліся, у іх рады ўліліся новыя сілы, узмацнілася партыйна-комсамольская праслойка, асноўная маса настаўніцтва БССР за рад гадоў праявіла сябе як лепшыя работнікі, адданыя справе выхавання новага социялістычнага пакалення ў духу комунізма. Але ёсць яшчэ астаткі і чужых нам людзей.

Вы з друку ўжо ведаеце аб тым, што і ў 1933 г. была раскрыта контррэволюцыйная нацдэмаўская арганізацыя. Як вам вядома, ў 1929-30 г. мы раскрылі так званы «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ), які ўзначальваўся Ластоўскім, Цвікевічам, Лёсікам і т. д., а ў 1933 г. аказаліся іх пераемнікі: Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Гаўрылюк, Валошын, Вальнец, Бурсевіч і т. д.—б. паслы польскага сойма.

Як яны самі потым прызналіся, яны спецыяльна прыехалі да нас для таго, каб працягваць справу Лёсіка, Ластоўскага, Цвікевіча і т. д.

Мы выкрылі контррэволюцыйную нацыяналістычную арганізацыю пад назвай «Беларускі нацыянальны цэнтр». Калі раней іх контррэволюцыйная арганізацыя называлася «Саюзам вызвалення Беларусі», то зараз яны перайменавалі яе ў «Беларускі нацыянальны цэнтр». Праграма іх заключалася ў рэстаўрацыі капіталізма, звароце зямель памешчыкам, фабрык і заводаў капіталістам, адкрыцці царквоў, якія закрыты, ліквідацыя ўсеагульнага абавязковага навучання, увядзенне платы за навучанне і т. д.

Ці апіраліся гэтыя агенты фашызма на каго-небудзь, ці яны былі ізаляваны, былі самі па сабе? Яны-ж шукалі апоры, яны думалі арганізаваць масы, якія, па іх думцы, павінны былі пайсці за імі. Яны шукалі апоры і сярод настаўніцтва Беларусі. Відома, асноўнай апоры яны шукалі ў кулацтва і сярод антысавецкіх элементаў. У масах настаўніцтва БССР яны не знайшлі ніякай апоры, але знайшліся такія элементы сярод настаўніцтва, якія аказаліся аднадумцамі з імі і вялі контррэволюцыйную работу супроць савецкай улады.

Дазвалю вам некалькі прозвішчаў настаўнікаў з б. людзей, якія ўключыліся ў нацыяналістычную контррэволюцыйную арганізацыю.

Вось, напрыклад, у Бярэзінскім раёне настаўнік Раніта Барыс — сын кулака, былы афіцэр. Ён вёў работу супроць савецкай улады.

У Бярэзінскай школе калгаснай моладзі быў філіял контррэволюцыйнай арганізацыі і кіраўніком гэтага філіяла быў Гецевіч Барыс, сын памешчыка, настаўнік Бярэзінскай школы калгаснай моладзі.

Гецевіч вербаваў кулакоў у контрэволюцыйную ячэйку.

У Чырвонапольскім раёне Хопкалеў Іван, сын кулака, настаўнік Кажамяцкай ШКМ, кіраваў контррэволюцыйнай ячэйкай і, больш таго, праводзіў шкодніцкую працу ў калгасе, падрываў калгас і вербаваў членаў у сваю арганізацыю.

Я прывёў некалькі прыкладаў для таго, каб вы ведалі, што класавая барацьба ў нас не скончылася. Мы разграмілі кулака, ліквідавалі ў асноўным яго як клас, але другая пяцігодка не будзе праходзіць ціха і гладка. Барацьба навокал яе будзе вялікая.

Астаткі разгромленага класавага ворага не думаюць добраахвотна здаць пазіцыі. Вораг пры апошніх сваіх уздыхах хоча насаліць савецкай уладзе, а таму будуць усякія спробы нашкодзіць савецкай уладзе і, галоўным чынам, будзе весціся работа па ўзрыву калгасаў знутры.

Аграмадная маса настаўнікаў працуе сярод калгаснікаў, у вёсцы. Аграмадная маса настаўніцтва з'яўляецца галоўнай культурнай сілай у вёсцы і аўтарытэтнай сілай, сілай, да якой прыслухоўваецца асноўная калгасная маса, як да перадавых культурных людзей.

Задача заключаецца ў тым, каб, ведаючы аб гэтых фактах, фактах кулацка-нацыяналістычнай работы, якая праводзілася рознымі нацыянал-дэмакратычнымі элементамі, завастраць сваю пільнасць, правяраць свае настаўніцкія рады і дапамагчы калгаснікам выкрываць класавага ворага, не даваць контррэволюцыйным астаткам нацыяналізма і кулацтва захапляць у школах, у калгасах.

Трэба зрабіць школы непрыступнай крэпасцю совецкай улады, каб ні адзін прахвост не знайшоў там сабе ніякага прытулку (апладысменты).

Трэба завастрэнне класавай пільнасці паставіць на главу бо, незалежна ад разгрому галоўных сіл кулацтва і антысавецкіх элементаў, не выключана, а абавязкова будзе абвастрэнне класавай барацьбы на тым ці іншым участку, у тым ці іншым раёне, а ў БССР, як у нацыянальнай рэспубліцы, як у рэспубліцы, працуючай на мяжы з капіталістычным Захадам, куды за пускае свае шчупальцы і міжнародны капіталізм, — тут класава-варожыя вылазкі безумоўна не выключаны.

Трэба зрабіць усе школы непрыступнай крэпасцю, совецка-партыйнай ідэалагічнай кузняй у вёсцы па перавыхаванню шырокіх калгасных мас, каб усе настаўнікі ў гэтых школах былі сапраўднымі прапагандыстамі ленінска-сталінскай ідэалогіі социялізма (апладысменты).

Трэба мець на ўвазе, што класавы вораг у школе імкнецца аслабіць барацьбу любога школьнага работніка за сапраўдную палітызацыю школы, ён імкнецца аслабіць работу настаўніка па ўстанаўленню сувязі тэорыі з практыкай сярод настаўнікаў і вучняў, прабуе аслабіць тую работу, якую праводзяць ужо многія нашы школы па ўцягванню вучняў у грамадска-вытворчую работу, стараецца прывіваць містычную ідэалогію, рэлігійныя забоны, аслабіць антырэлігійную барацьбу.

Выхоўваць дзяцей у духу інтэрнацыяналізма

У нас, у БССР, асаблівае значэнне мае інтэрнацыянальнае выхаванне дзяцей.

Прывіўка дзецям прынцыпаў інтэрнацыяналізма ва ўмовах БССР, як нацыянальнай рэспублікі, — гэта галоўная палітычная і ідэалагічная задача настаўніка, бо нацыяналістычныя элементы больш за ўсё стараліся развіць кулацкі нацыяналізм.

Таму выкрыццё контр-рэволюцыйнай сутнасці нацыяналістычных элементаў, барацьба з выпустошваннем класавай сутнасці з вучобы (а ў нас такія моманты ёсць), барацьба з апортунізмам настаўнікаў (а ў час такія моманты таксама ёсць)—важнейшыя задачы. Сярод настаўнікаў яшчэ ёсць асобныя апалітычныя элементы. Не можа быць у нас, у совецкай краіне, апалітычных настаўнікаў. Няма навукі надкласавай, апалітычнай. Таксама няма і асветы, школы надкласавай, апалітычнай, а значыць не павінна быць і настаўнікаў апалітычных.

Розніца нашай палітыкі ад буржуазнай заключаецца ў тым, што мы абаранялі інтарэсы рабочага класа і працуючага селянства. Розніца совецкага настаўніка ад настаўніка буржуазнай школы ў тым, што наш настаўнік выхоўвае людзей, якія змагаюцца за інтарэсы рабочага класа і калгаснікаў, а настаўнік буржуазнай школы выхоўвае людзей на абарону капіталізма. Таму трэба весці барацьбу з апалітычнасцю асобных настаўнікаў, барацьбу з схаластычнымі метадамі работы, барацьбу за тое, каб кожны настаўнік быў і палітычна падкаваны, падкаваны марксісцка ленінскай тэорыяй, змагаўся за тое, каб кожны совецкі настаўнік аўладаў марксісцкай метадалогіяй, марксісцкай педагогікай.

Пакуль ён не аўладае марксісцкай метадалогіяй, ён напалову настаўнік, нават і тады, калі ён зусім добрасумленна працуе.

Вырашэнне ўсіх гэтых практычных канкрэтных задач і прывядзе ўсіх нас, усіх настаўнікаў БССР, а значыць і ўсе школы да таго, што яны будуць у нас самым магутным вагаром марксісцка-ленінска-сталінскага выхавання найшырэйшых мас рабочай і калгаснай моладзі і што настаўнікі будуць лепшымі дапаможнікамі партыі па перавыхаванню ўсіх працоўных у сапраўдных сябрамі і актыўных будаўнікоў социялізма (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Фота А. МІКУЦКАГА.

На здымках: Злева—дзед ударнік калгаса «Платоны-шырні» (Сенненскі раён)—Сафон Лагуноў (мае 75 год), рамантуе ў калгасе інвентар, збрую і ўсе конскія прылады. У 1933 г. гав. Лагуноў выпрацаваў 336 працадзён; справа—конюх калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (Сенненскі раён)—Дубавец Фёдар.

Зацверджана Советам Народных Камісараў Саюза ССР ад 11-га сакавіка 1934 г.

Аб плане трактарных работ машына-трактарных станцый і аб заключэнні дагавораў МТС з калгасамі на 1934 год

Пастанова Народнага Камісарыята Земляробства СССР

10-га сакавіка 1934 г.

1. Абавязаць краявыя (абласныя) земельныя кіраўніцтвы і народныя камісарыяты земляробства рэспублік закончыць заключэнне дагавораў МТС з калгасамі:

па Сярэдняй Азіі, Паўднёваму Казакстану, ЗСФСР, Крымскай АССР, Паўночна-Каўказскаму краю, Маладаўскай АССР, Одэскай і Дніпрапятроўскай абласцях Украінскай ССР—не пазней 20-га сакавіка.

па ЦЧВ, Саратаўскаму краю, Сталінградскаму краю, Сярэдня-Волжскаму краю, Азова-Чорнаморскаму краю і па Харкаўскай, Данецкай, Вінніцкай, Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцях Украінскай ССР—не пазней 20-га сакавіка.

па ўсіх астатніх краях, абласцях і рэспубліках—не пазней 10-га красавіка 1934 г.

Абавязаць краявыя (абласныя) земельныя кіраўніцтвы і народныя камісарыяты земляробства рэспублік і дырэктароў машына-трактарных станцый забяспечыць дагаворную кампанію неабходнай колькасцю экземпляраў прыкладнага дагавора, скарыстаўшы краявыя, раённыя і палітаддзельскія друкарні.

2. Устанавіць на 1934 г. наступны план веснавых трактарных работ машына-трактарных станцый у пераводзе на ворыва:

	Аб'ём веснавых трактарных работ у тыс. га
Паўночны край	33,9
Карэльская АССР	5,9
Ленінградская вобласць	147,0
Заходняя вобласць	190,1
Маскоўская вобласць	406,3
Іванаўская вобласць	128,3
Горкаўскі край	301,5
ЦЧВ	2.230,9
Чэлябінская вобласць	1.301,8
Свердлоўская вобласць	506,5
Об-Іртышская вобласць	18,8
Башкірская АССР	350,9
Татарская АССР	297,4
Сярэдня-Волжскі край	2088,2
Саратаўскі край	1920,0
Сталінградскі край	1188,9
Паўночна-Каўказскі край	1140,0
Азова-Чорнаморскі край	2620,9
Крымская АССР	317,2
Казакская АССР	1356,8
Кара-Калпакская АССР	24,2
Кіргізская АССР	120,5
Заходня-Сібірскі край	2.412,5
Усходня-Сібірскі край	552,2
Якуцкая АССР	8,5
Далёка-Ўсходні край	405,2
Украінская ССР	7.842,7
Беларуская ССР	235,6
Закаўказская СФСР	301,5
Узбекская ССР	626,8
Туркменская ССР	119,0
Таджыкская ССР	117,0
Усяго па СССР	29.317,0

У аб'ём веснавых трактарных работ уваходзяць усе веснавыя работы, ранчаючы папарамі.

Пры ўстанаўленні размераў трактарных работ адзін гектар бараванання прыраўноўваецца да 0,15 гектара ворыва, адзін гектар дысавання і культывацыі прыраўноўваецца да 0,3 гектара ворыва і адзін гектар пасева—да 0,15 гектара ворыва.

Народны камісар земляробства Саюза ССР Я. ЯКАЎЛЕЎ

Падрыхтоўка да сяўбы—баявая задача КП(б)Б

НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ РАДЫЁПЕРАКЛІЧЦЫ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ РАЁНАЎ БССР ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

Загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Картукоў у сваім уступным слове адначыў, што галоўнай мэтай радыёперакліччы з'яўляецца праверыць, наколькі ў раёнах правільна зразумелі пастановы партыі і ўрада па пытаннях сяўбы, праверыць ,наколькі мерапрыемствы, якія праводзяць у раёнах, забяспечваюць паспяховае вырашэнне пастаўленых задач.

Прапанаваўшы ўдзельнікам нарады выказацца па пытаннях засыпкі насення, абмену і праверкі яго на ўсхожасць, рамонта трактароў і сельскагаспадарчых машын, вывазкі гною і становішча конскага паголоўя, тав. Картукоў дае слова Мазырскаму раёну.

Адміністратыўны запал мазырскіх кіраўнікоў

Суровае папярэджанне ЦК КП(б)Б аб неабходнасці згуртавання ўсёй увагі на спынненне дзяцінства знішчэння конскага паталоўя ў Мазырышчыне зразумелі толькі ў тым сэнсе, што трэба павялічыць колькасць выязных судовых сесій, павялічыць судовыя рэпрэсіі, і ўсё. Ніякай масавай работы вакол гэтай пастановы ЦК у раёне не праводзяць. Ні сакратар райкома т. Клімчук, ні старшыня райвыканкома тав. Жогаў не зразумелі неабходнасці разгортвання масава-растлумачальнай работы, арганізацыі грамадскай думкі шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў вакол справы захавання і падрыхтоўкі конскага паголоўя.

Выкліканы да мікрафона Мазырскі пракурор т. Баркан таксама не мог сказаць, якая ўсё-ж масавая работа праводзіцца ў раёне вакол выканання гэтага баявога задання партыі. Замест арганізацыі грамадскіх судоў, груп садзейнасці пракуратуры Мазырская пракуратура пашла па шляху штампавання судовых пастаноў, не пакланацыўшыся нават праверыць, наколькі гэтыя пастановы абгрунтаваны. Безумоўна, меў рацыю пракурор рэспублікі г. Кузьмін, які заўважыў кіраўнікам Мазыршчыны, што пры такой рабоце, толькі судовымі рэпрэсіямі, яны не выканаюць пастановы ЦК.

Гэта пагоня за адміністратыўнымі мерапрыемствамі характэрна ў Мазыршчыне не толькі ў справах захавання конскага паголоўя, але і ў забеспячэнні веснавой сяўбы добраякасным насеннем. І тут прэзідыум РВК замест арганізацыйнай масавай работы заняўся аддачай пад суд старшынь калгасаў.

Нагул, на Мазыршчыне яшчэ не перабудавалі работу на аснове пастаноў ЗУІІ з'езда партыі. Тут яшчэ працуюць па старыцы: выносяць шмат пастаноў, склікаюць нарады, злёты, але справы не відаць. Гэта ярка выявілася ў пытанні аб скарыстанні ялавак для вывазу гною на палі. Старшыня райвыканкома тав. Жогаў вельмі "ногга расказаў прысутным на , дыёперакліччы аб тым, што ў раёне ўжо падабрана 200 ялавак для работы на полі, што ў гэтым напрамку раённымі арганізацыямі шмат ужо зроблена. А на праверцы, калі тав. Картукоў паклікаў да мікрафона старшыню калгаса імя Варашылава т. Савенкова, выявілася, што нічога канкрэтнага яшчэ не зроблена, што ў калгасе, дзе ёсць магчымасць выкарыстаць 10 ялавак для вывазу гною, аб гэтым толькі думаюць, мяркуюць, плануюць, але нічога не робяць.

Словы і сапраўднасць

Калі паверыць сакратару Жлобінскага райкома КП(б)Б т. Плешакову, то ў раёне з падрыхтоўкай да сяўбы справы абстаяць даволі добра. І насенне ёсць, і ачыстка не дрэнна ідзе, і коні праверены, і дагледжаны, адным словам, як быццам усё ў парадку. Такое ўражанне магло скласціся ў удзельнікаў радыёперакліччы, выслухаўшы прамову тав. Плешакова ля мікрафона. Тым больш, што пераважную частку яго прамовы ўхваліў і начальнік палітаддзела т. Брыгневіч.

Але пры першай праверцы аказалася, наколькі словы далёкі ад сапраўднасці. У Жлобінскай рэдыёстудыі ў час перакліччы аказаўся прадстаўнік Наркамзема т. Пінкес, якая пачала расказваць аб тым, наколькі жлобінскія калгасы і аднаасобнікі сапраўды падрыхтаваны да сяўбы.

— Раённая арганізацыя, — гаворыць т. Пінкес, — праводзіць дэкаднік праверкі засыпкі і абмену насення. Дэкаднік ужо канчаецца, але ні ў калгасах, ні ў аднаасобным сектары дэкаднік не адчуваецца. Выдучаныя ўпаўнаважаныя райкома ў радзе сельсоветаў яшчэ і не былі, ніякага кантролю за ачысткай насення ў калгасах няма. 40-50 проц. засыпаных зернавых культур загмечаны. Гэта я асабіста бачыла ў калгасах «Чырвоны комунар», «Прывітанне», у польскім нацыянальным калгасе «Орка» і ў радзе іншых. Калі прыходзіш у калгас і пытаешся, ці ачышчана насенне, табе адкажуць, што ўсё зроблена, а праверыш, аказваецца, што нічога падобнага няма. У радзе калгасаў да ачысткі насення яшчэ і не прыступілі. Кантрольныя насенныя пункты затрымліваюць аналізы на ўсхожасць па тры месяцы і больш. Кармавых фондаў на час веснавой сяўбы амаль што ні ў адным калгасе не складзена.

Выступленне т. Пінкес вельмі збянтэжыла тав. Плешакова, начальніка палітаддзела, дырэктара МТС і іншых прадстаўнікоў Жлобінскага раёна. Таварышы прабавалі аспрэчваць яе выступленне, але нічога грунтоўнага яны сказаць не маглі. Тав. Брыгневіч—начальнік палітаддзела пасля настойлівых запытанняў тав. Ратнека, быў вымушан адзначыць, што выступленне тав. Пінкес абгрунтаванае, што прыведзеныя ёю факты адпавядаюць сапраўднасці.

Характэрная дэталь — да апошніх дзён у Жлобінскім раёне для аналіза, бралі насенне толькі ў адным кутку і аналізы паказвалі няправільныя разультаты. Яшчэ ў кастрычніку мінулага года Наркамзем разаслаў у раёны загад, паводле якога пробы для аналіза насення трэба ўзяць зверху, з сярэдзіны і знізу, каб, такім чынам, атрымаць аналіз усяго засыпанага насення. Выкліканы да мікрафона намеснік загадчыка райза т. Шпак і агранам Непылькін паказалі сваю поўную непісьменнасць у гэтым пытанні, яны вымушаны былі прызнаць, што загад Наркамзема нават не чыталі. У выніку ўсе зробленыя аналізы на ўсхожасць па раёну трэба нанава праверыць.

І гэта называецца ў Жлобіне усебакова падрыхтавацца да веснавой сяўбы.

Не ігнараваць аднаасобніка—заўтрашняга калгасніка

Пытанне падрыхтоўкі да сяўбы ў аднаасобным сектары мае асабліва важнае значэнне для Рагачоўскага раёна, дзе процант калектывізацыі яшчэ нізкі. Аднак, раённыя арганізацыі на гэту адказнейшую справу звяртаюць вельмі мала ўвагі. Гэта ярка выяўляецца ў пытанні правядзення агляду конскага паголоўя ў аднаасобным сектары. Не гледзячы на выразную пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб вылучэнні ўпаўнаважаных на дзесяцідворках, з тым, каб ў час правядзення ўсебеларускага агляду конскага паголоўя праверыць усіх коняй у аднаасобным сектары, Рагачоўскі райком КП(б)Б нічога ў гэтым напрамку не зрабіў. Больш таго: сакратар райкома тав. Гоўрасёў нават не ведае, калі гэты аглад оудзе праведзен, і што такія ўпаўнаважаныя павінны быць вылучаны. Вось як у Рагачове чытаюць пастановы партыі і ўрада.

Усе сілы на выкананне планаў сяўбы

Падагуліўшы вынікі радыёперакліччы, тав. Картукоў адзначыў, што шмат дзе справа падрыхтоўкі да сяўбы пакінута на самацёк, патрэбнай арганізаванасці ў рабоце яшчэ няма.

— Возьмем, — гаворыць тав. Картукоў, — выступленне старшыні Мазырскага РВК тав. Жогава. Вы чулі, як ён гаварыў аб арганізацыі цягла, аб выкарыстанні кароў. Чалавек кажа што гэта справа падрыхтавана, што ўсё зроблена, а калі мы праверылі, аказалася, што не зроблена нічога.

Возьмем пытанне наконт выбару ўпаўнаважаных дзесяцідворак. Ад усіх выступаўшых толькі і чуваць было, што гэта справа разгортваецца, падрыхтоўваецца, паслалі, разаслалі, але ніхто толкам не мог сказаць, што сапраўды зроблена. Зусім ясна, што людзі ў гэтай галіне нічога не зрабілі.

Возьмем жлобінскага агранома, які, здавалася-б, у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы павінен быў весці за сабой масу. А ён нават не ведае інструкцый, якія даюцца кіруючымі органамі ў галіне яго работы.

З такімі з'явамі трэба рашуча пакончыць. Трэба пабольшэвіцку ўзяцца за выпраўленне памылак, каб, мабілізуючы шырокія масы калгаснікаў, выканаць задачы, пастаўленыя перад намі партыяй і ўрадам.

ПЕРШЫЯ КРОКІ ПЕРАБУДОВЫ

На заводзе імя Варашылава ў Менску да перабудовы было 8 цэхавых парт'ячэек. Зараз — 12 груп з парторгамі, якія непасрэдна падпарадкаваны заводскаму партыйнаму камітэту. Парторг самастойна і непасрэдна кіруе партгрупай сваёй змены ці брыгады. Ён перад парткомам нясе поўную адказнасць і за вытворчую работу, і за масавую, і за вучобу і т. д. Парторг даручае таму ці іншаму комуністу адпаведную работу, патрабуе яе выканання, сам займаецца праверкай. Аб усім праробленым запісваецца ў дзённік парторга.

Члены парткома таксама нясуць адказнасць за работу ў сваіх партыйных групах. Тым больш, што на заводзе імя Варашылава ўстаноўлены дзяжурсты членаў парткома на ўсіх зменах. І гэта прыносіць надзвычай вялікую карысць. Дзяжурны член парткома Базарынаў ноччу правёў мітынг рабочых па арганізацыі дапамогі пролетарыям Аўстрыі. Дзяжурны член парткома Сямёнаў пачуў па радыё, што ў Маскву прыбылі Дзімітраў, Папоў і Танеў. Ён зараз-жа правёў мітынг рабочых. А раней, каб правесці што, патрэбна было засядаць, дагаворвацца, вылучаць адказных і т. д.

У некаторых цэхах была такая пабудова партарганізацый, што ні колі нават нельга было склікаць партыйнага сходу. У такарным цэху, напрыклад, працуюць на тры змены, і сходы можна было праводзіць толькі ў выхадныя дні або па зменах.

Разам з ліквідацыяй цэхавых ячэек і стварэннем самастойных груп на заводзе арганізаваны новыя партыйныя групы на такіх участках, як брыгада шырспажыву. Прапрацоўваючы рашэнні XVII з'езда ВКП(б), яна абавязалася даць да канца 1934 года на 100.000 руб. тавараў звыш плана. У выніку перабудовы работа значна палепшылася ва ўсіх групах, асабліва ў кацельным цэху, у брыгадзе фармоўшчыкаў і інш. Парторг сам прапануе комуністам здаваць нормы на тэхмінімум, у той час як раней па такіх пытаннях трэба было засядаць, склікаць бюро і т. д. Партком таксама стаў менш засядаць.

Асабліва каштоўным з'яўляецца тое, што ва ўсёй рабоце партарганізацыі завода імя Варашылава галоўны ўпор робіцца на выкананне першага пункта статута аб абавязках комуніста.

Д-аў.

АРГАНІЗУЕМ РЭЙД ДРУКУ ПА ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАННЯ РАШЭННЯ ПАРТ-З'ЕЗДА АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Усім селькорам, калгасным насценгазетам, рэдактарам палітаддзельскіх, раённых, абласных і краявых сельскагаспадарчых газет

Сёлетні год павінен стаць годам пералому ва ўсёй жывёлагадоўлі. Такава цвёрдая дырэктыва XVII з'езда ВКП(б), правадыра партыі тав. Сталіна.

Выканаць гэту задачу можна толькі пры ўмове ліквідацыі ялавасці і захавання ўсяго прыплоду ад пагалоўя сёлетняга стада.

Вясна 1934 года павінна стаць баявой вясной у жывёлагадоўлі. Іменна вясной закладваецца поспех усяго жывёлагадоўчага года. Мы абавязаны з большэвіцкай энергіяй вырашыць увесь складаны вузел веснавых работ у жывёлагадоўлі—узорна правесці злучную кампанію, арганізавана сустрэць новы ацёл, акот і апарос, захаваць маладняк ад падзяжу і забою, забяспечыць неабходную кармовую базу ў яравым кліне.

Масавы рух за ўзняцце жывёлагадоўлі, які разгарнуўся сярод калгаснікаў, часта натыкаецца на раней-шую бяздзейнасць многіх мясновых арганізацый і канцылярска-бюракратычнае кіраўніцтва земорганаў. Многія земоргаиы і самі праўленні калгасаў яшчэ не прынялі неабходных мер да таго, каб зрабіць гэты год сапраўды пераломным годам у жывёлагадоўлі.

Паліткіраўніцтва НКЗ СССР і рэдакцыя «Социалистического земледелия» аб'яўляюць да мая ўсесаюзны рэйд па праверцы выканання рашэнняў XVII партз'езда аб жывёлагадоўлі.

Мы заклікаем уключыцца ў гэты рэйд усю селькораўскую армію і ўвесь калгасны друк—брыгадныя і калгасныя насценгазеты, палітаддзельскія і раённыя газеты, сельскагаспадарчыя газеты краёў і абласцей.

Задачы рэйду заключаюцца ў тым, каб дзелавым чынам, без параднай шуміхі, без славеснай трасакатні на кожным канкрэтным участку праверыць:

Як падрыхтаваны фермы к прыёму зімняга і веснавога прыплоду (стан памяшканняў, падрыхтоўка кадраў, унутраны распарадак, начныя дзяжурствы, правільнае кармленне матак, зоаветабслугоўванне, ажыццяўленне здзельнічыны і натуральнага прэміравання за захаванае прыплоду).

Як ідзе кантрактацыя і закупка цёлак для бескароўных калгаснікаў (выкарыстанне крэдытаў, давядзенне ільгот да кантрактанта, дапамога калгаснікам кармамі, абмен бычкоў на цёлак, барацьба з драпежніцкім забоем маладняка, растлумачальная работа).

Як падрыхтоўваецца злучная кампанія (размеркаванне і праверка вытворнікаў, барацьба супроць ялавасці, забеспячэнне вытворнікамі жывёлы калгаснікаў і аднаасобнікаў).

Як расшыраецца кармовая база (якасць хавання і прыгатаванне кармоў, правільнасць складзеных севазваротаў, засыпка і якасць насенфондаў траў і іншых кармовых культур, падрыхтоўка да палянпэння і скарыстання лугоў і пасбішч).

Правяраючы земоргаиы, калгасы і фермы па тэхніцы канкрэтных участках барацьбы за ўздым жывёлагадоўлі, усе ўчасткі рэйда павінны шырока асвятляць станоўчы вопыт, выкрываць паказную, парадную «перабудову», дабівацца дзелавога палянпэння жывёлагадоўчай гаспадаркі і неадкладнага выпраўлення над кіраўніцтвам мясновых арганізацый і палітаддзелаў МТС усіх выкрытых рэйдам недахопаў.

Чакаем ад мясцовага друку ўключэння ў рэйд, арганізацыі селькораўскіх брыгад па правядзенню рэйда, шырокага асвятлення ходу рэйда і яго рэзультатаў на старонках газет.

ПАЛІТКІРАЎНІЦТВА МТС НКЗ СССР.
Рэдакцыя «СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ЗЕМЛЕДЕЛИЯ».

Рэдакцыя «Звязды» ўключаецца ў рэйд друку па праверцы выканання рашэнняў партз'езда аб жывёлагадоўлі, арганізуемы паліткіраўніцтвам МТС НКЗ СССР і рэдакцыяй «Социалистическое земледелие».

«Звязда» бярэ пад свой нагляд групу жывёлагадоўчых раёнаў (Слуцак, Бабруйск, Мазыр, Клімавічы, Касцюковічы, Магілеў, Быхаў, Полацак) і заклікае ўсіх селькораў, насценгазеты, раённы і палітаддзельскі друк уключэннем у рэйд і большэвіцкім яго правядзеннем заваяваць для БССР адно з першых месц у Саюзе па рэалізацыі рашэнняў XVII партз'езда і ўказанняў т. Сталіна аб развіцці жывёлагадоўлі.

АБ СТАНОВІШЧЫ ГАРАДСКОЙ ВЯЧЭРНЯЙ СОУПАРТШКОЛЫ

ПА СТАНОВА БЮРО МЕНСКАГА ГК КП(б)Б

Праверкай вячэрняй соўпартшколы выяўлена зусім недапушчальнае становішча партвучобы: павярхоўная прапрацоўка рашэнняў XVII з'езда, наведванне школы — 50-60 проц., слабае ўсвойванне прапрацоўваемых матэрыялаў, абасобленасць груп, працуючых у школе, адсутнасць соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце школы і т. д.

Прычынай такога правалу з'яўляецца бяздзейнасць кіраўніка школы т. КОТАВА, фармальныя адносіны да сваіх абавязкаў прапагандыстаў школы (т.т МАРГОЛІН, КУБЛІЦКІ, МАЛАКОВІЧ) і нерэзаванне з боку парткомаў (СНК, кіраўніцтва сувязі, камгас, лямцавая фабрыка і інш.) на прагулы членаў партыі, выпучаных на вучобу.

Бюро ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Зняць з работы загадчыка вячэрняй соўпартшколы Беларусі тав. Котава, як незабяспечыўшага належнага кіраўніцтва школай. Даручыць парткому ВКСГШБ, адкуль выпучан т. Котаў, разгледзець гэта пытанне ў партыйным парадку.

2. Выпучыць загадчыкам вячэрняй соўпартшколы т. Смоляра — студэнта 3-га курса ВКСГШБ, члена партыі з 1928 г., прапагандыста шчотачнай фабрыкі.

3. Указаць прапагандыстам школы, што з іх боку былі фармальныя адносіны да сваёй работы, нерэзаванне на ...ад істотнейшых і недапушчальных недахопаў у рабоце школы.

4. Абавязаць вышэйперапічаныя парткомы забяспечыць наведванне школы выпучанымі таварышамі.

5. Даручыць культпропу ГК рэгулямачыць гэту пастанову бюро на сходзе слухачоў і прапагандыстаў школы.

Сакратар ГК КП(б)Б РЫСКІН.

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

ХАБАРАЎСК, 11. (БЕЛТА).

Згодна апошніх радыёграм, параход «Сталинград» увайшоў у бухту Корфа, сустрэўшыся з непра ходнымі ільдамі.

Капітан парахода Караянаў паведамляе аб надзвычай радным руху ільдоў з Берынгавай пратокі на поўдзень. Вялікія паўночныя вятры гоняць ільды і вымушаюць вы чакаць момант для далейшага руху наперад.

***

ХАБАРАЎСК, 11 (БЕЛТА).

Ва Владзівастоку закончылі пагрузку і бункероўку параходы «Сергей Кіраў» и «Днепрострой», якія маюць назначэнне на Камчатку. Адыход іх назначан у бліжайшыя дні. Гэта павялічвае перспектывы ва ўзмацненні і паскарэнні дапамогі чэлюскінцам.

***

ХАБАРАЎСК, 10 (БЕЛТА).

У Хабараўску пачата зборка самалётаў лётчыкаў Галышава і Даронiна. Кіраўніцтвам грамадзянскага паветранага флота прыняты ўсе меры для хутчэйшай іх зборкі. Заўтра чакаецца прыбыццё самалёта т. Вадапьянава. Адлёт начнецца на 14-е сакавіка. Мяркуецца, што пілоты Вадапьянаў, Галышаў і Даронін вылецяць адначасова.

***

ХАБАРАЎСК, 11 (БЕЛТА).

Зімоўшчыкі застраўшых на поўначы суднах «Хабараўск» і «Анадыр» паслалі на дапамогу чэлюскінцам сваіх радыстаў, якія на сабаках прыбылі на мыс Якань і на мыс Паўночны. Задача радыстаў—узмацніць сувязь з лагерам Шмідта і сухазем'ем.

ХАБАРАЎСК, 11 (БЕЛТА).

11-га сакавіка ў 21 гадзіну маскоўскага часу параход «Смоленск» паведаміў, што ён упэўнена ідзе наперад скрозь сустрэчныя штормавыя вятры і мінаваў Камандорскія астравы.

З парахода паведамляюць таксама аб некаторым паляпшэнні пагоды ў раёне на поўнач ад Олюторкі, дзе за апошнія дні бушавалі лютыя штормы, якія ледзь не пазбавілі парахода «Сталинград» кіравання і радыёсувязі.

***

ХАБАРАЎСК, 11 (БЕЛТА).

З парахода «Смоленск» паведамляюць: «Трымаем курс на мыс Олюторскі, дзе сустрэнемся са «Сталинградам» і прымем ад яго самалёты «Ш—2», пасля чаго «Сталинград» вернецца ў Петрапаўлаўск—на Камчатцы для прыёму кі вугалю і самалётаў, якія ідуць з Владзівастока. Каб прыйсці ў бухту Правідзенне, мяркуем пачаць для пошукаў дарогі лёдавую разведку самалётам».

Як паведамляе «Сталинград», мора зусім чыстае ад ільду да траверза мыса Анастасіі (100 міль на поўнач ад Олюторкі).

На борту «Смоленска» знаходзіцца вядомы на Камчатцы каюр Сергей Афанасьевіч Скурыхін з 12 камчацкімі сабакамі. На працягу многіх год т. Скурыхін з'ездзіў на сабаках уздоўж і ўпоперак увесь раён бухты Правідзення і мыса Лаўрэнція. Разам з т. Ушаковым ён шэсць год зімаваў на востраве Врангеля.

***

ХАБАРАЎСК, 10 (БЕЛТА).

Энергічна разгортваецца работа па падрыхтоўцы палёта т. Вадапьянава. Устаноўлена радыёсувязь з Нагаева. Аэрадромы ў Нагаева і Гіжыга ў добрым стане. Аэрадром у Каменскім будзе закончан заўтра. Памяшканне, прыём, харчаванне лётнаму складу ў гэтых пунктах забяспечаны.

***

ХАБАРАЎСК, 10 (БЕЛТА).

Сёння пілот Ляпідзеўскі прадпрыняў другі палёт у лагер Шмідта. Аднак, перабоі ў левым маторы прымусілі яго спыніць палёт і вярнуцца ў Уэлен. Згодна атрыманых вестак, прадаўжаецца дрэйф лагера Шмідта на захад.

***

ХАБАРАЎСК, 10 (БЕЛТА).

9-га сакавіка «Смоленск» пакінуў Петрапаўлаўскі порт, трымаючы курс на бухту Правідзенне. 12-гадзінная стаянка парахода скарыстана з максімальнай эфектыўнасцю. Папоўнен запас прэснай вады, пагружаны цёплыя рэчы. Згод на апошніх вестак, параход знаходзіцца на поўнач ад Усць-Камчацка.

ПУШЧАНА ПЕРШАЯ ЧАРГА МЕНСКАЙ ЦЭЦ

ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ, ГК КП(б)Б тав. РЫСКІНУ, ЦЭНТРАЛЬНАМУ ОРГАНУ ЦК КП(б)Б—«ЗВЯЗДЗЕ»

РАПАРТ

Ударнікі, комуністы, комсамольцы, спецыялісты і кіраўніцтва будаўніцтва Менскай ЦЭЦ рапартуюць ЦК КП(б)Б і яго кіраўніку т. ГІКАЛО, ураду БССР, гаркому КП(б)Б, рабочым і калгаснікам Совецкай Беларусі.

У рэзультаце ўпартай і штодзеннай барацьбы—першая чарга Менскай ЦЭЦ сёння дала першы прамысловы ток.

Пробны пуск прайшоў без адзінай аварыі, усе агрэгаты працуюць здавальняюча.

Баявое заданне ЦК і яго кіраўніка т. ГІКАЛО калектыў будаўнікоў, мабілізаваны комсамол па-баявому выканаў.

Гэтым поспехі дасягнуты намі на аснове правільнага кіраўніцтва і штодзённай аператыўнай дапамогі ЦК КП(б)Б і ў прыватнасці, т. ГІКАЛО.

Няхай жыве партыя большэвікоў і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве наш сталёвы СТАЛІН!

Начальнік і галоўны інжынер будаўніцтва ЦЭЦ **СТАШЭНКА.**

Сакратар парткома **ВАРНО.**

Старшыня будкома **АГЕНЕЦ.**

Сакратар калектыва **ЛКСМБ КАРДАШЭНКА.**

ІМЯ СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ

Роўным паўкругам, з ганарлівa ўзнятымі штакдарамі, стаяць наўкол трыбуны рады будаўнікоў, рабочых суседніх фабрык і заводаў, чырвона армейцаў. З розных бакоў на пляцоўку перад будынкам сілавой станцыі ЦЭЦ безупынна, пад бадзёры, чоткі рытм аркестраў, прыбываюць калоны людзей новай індустрыяльнай Ляхаўкі.

А 4-й гадзіне пляцоўку запаўняюць рабочыя і работніцы электрастанцыі, завода імя Варашылава, «Комунаркі», «Большэвіка».

Тав. ЖУКОВІЧ ад імя Менскага гарадскога совета абвяшчае мітынг, прысвечаны пуску цеплаэлектрацэнтралі, адкрытым.

Начальнік будаўніцтва і галоўны інжынер ЦЭЦ тав. СТАШЭНКА выразнымі, скупымі словамі — красамоўем лічбаў і фактаў — гаворыць пра гісторыю будоўлі, пра яе будучыню, пра людзей, што сваёй адданасцю і энтузіязмам забяспечылі пуск станцыі.

— Вопытныя іспытанні станцыі і падача току пачаліся 10 дзён назад. Іспытваўся адзін кацёл. Станцыя давала капя 700 кіловат электрычнай энергіі, якая ішла па двух лініях. Яе атрымлівалі Менская МТМ, мясакамбінат і іншыя прадпрыемствы — па адным баку станцыі, а потым іспытанні ішлі па лініі «Комунаркі», фабрыкі імя Крупскай і інш.

Вопыты далі здавальняючыя вынікі, аварый не было. Станоўчыя рэзультаты па іспытанні аднаго катла даюць зараз магчымасць пусціць станцыю на два катлы. Такім чынам, ЦЭЦ ПЕРШАЙ ЧАРГІ БУДЗЕ ДАВАЦЬ 1.500 КІЛОВАТ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ. Пройдзен будаўнічы перыяд. Станцыя—у перыядзе асваення. Яна ўваходзіць у эксплаатацыю.

Кадрамі ЦЭЦ забяспечана. Частка работнікаў запрошана з Макеўкі, частка вылучана з асяродзішча будаўнікоў і падрыхтавана на спецыяльных курсах.

А 5-й гадзіне тав. СААК'ЯН — намеснік старшыні СНК БССР — перарэзае стужку ў пусковага вінціля. Уключаецца рубільнік.

— ЁСЦЬ ТОК!

Над трыбунай, усцяж фронтона галоўнага будынка, над галовамі прысутных загараецца гірлянда чырвоных лямпак. Тав. Саак'ян — на трыбуне, пя мікрафона. Ён вітае з буйнай перамогай калектыў рабочых, ІТР, адміністратыўна-тэхнічны персанал цеплаэлектрацэнтралі ад імя Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б.

— Мы дабіліся гэтага новага поспеху — пуску першай чаргі магутнай ЦЭЦ — дзякуючы брацкай дапамозе саюзнага ўрада, дзякуючы неаслабнаму кіраўніцтву ЦК нашай партыі, дзякуючы асабістай увазе да будаўніцтва з боку тав. Н. С[illegible]КАЛО, — гаворыць тав. Саак'ян. Гэта новая перамога яшчэ раз паказвае, што рабочы клас Совецкай Беларусі—не на апошнім месцы, што ён здолен на вялікую творчую працу, на будаўніцтва сапраўдных гігантаў социялістычнай індустрыі!

Прамоўцы змяняюць адзін аднаго...

Пра вялікую ролю комсамола ў будаванні цэплаэлектрацэнтралі гавораць т. т. ЛУБЕНСКІ і КАРДАШЭНКА. Сотні і тысячы комсамольцаў працавалі тут на суботніках, 100 чалавек з іх замацаваліся на ўвесь час эксплаатацыі ЦЭЦ. Палова ўсіх рабочых на цеплаэлектрацэнтралі — комсамольцы і комсамолкі.

— Комсамолія ўдарна білася за тэрміны пуску, — наш абавязак таксама ўдарна змагацца за бездаварыйнасць пушчанай ЦЭЦ, за догляд за якасцю работы на ёй, за глыбокае, сур'ёзнае аўладанне тэхнікай.

Пра гераічныя, напружаныя тэмпы працы мантажнікаў, мулярў, арматуршчыкаў, пра зладжанасць і маналітнасць усяго рабочага калектыва гавораць т. т. ДЗЕМІДАЎ, ЦЭЙТЛІН, ВАСКРАСЕНСКІ.

Сакратар парткома ЦЭЦ тав. ВАРНО прапануе назваць новапушчаную ЦЭЦ імем Наркамцяжпрома тав. СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ.

У адказ выбухаюць шумныя воплескі. Прапанова прымаецца аднагалосна.

Пасля заслухання пастановы СНК БССР аб прэміраванні кіраўнікоў і актыўных удзельнікаў будаўніцтва стройныя арганізаваныя калоны праходзяць праз машынную залу, аглядаюць асобныя агрэгаты.

... Над пляцоўкай вісяць вячарнія эмрокі, цярушацца на ветры халодныя сняжынкі, але доўга-доўга не хочацца пакідаць гэта месца радаснай урачыстасці. На змену старой Ляхаўцы — брудная акраіна, поўнай гвалту, п'янкі ды панажоўшчыны, даўно прышчу новы, фабрычна - заводскі квартал, з вясёлымі трамвайнымі званнямі, з прадпрыемствамі, абсталяванымі паводле апошняга слова тэхнікі. І ў гэтай новай Ляхаўні ЦЭЦ — адно з самых выдатных дасягненняў!

Разам з новай Ляхаўкай учора спраўляў урачыстасць увесь Менск, святкаваў новую перамогу ўвесь рабочы клас Совецкай Беларусі.

ЮР. ЛЯВОНЫ.

Аб прэміраванні лепшых ударнікаў па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

У сувязі з паспяховым датэрміновым сканчэннем будаўніцтва першай чаргі менскай ЦЭЦ Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абвясціць пролетарскую падзяку рабочаму калектыву і інжынерна-тэхнічнаму персаналу будаўніцтва Менскай ЦЭЦ.

2. Прэміраваць наступных лепшых ударнікаў па будаўніцтву ЦЭЦ:

1) Тав. СТАШЭНКА НІКАЛАЯ НІКІЦІЧА — начальніка і галоўнага інжынера пабудовы, які ўпартай працай і настойлівасцю забяспечыў паспяховае сканчэнне пабудовы, — ганаровай граматай і 1.000 руб.

2) Тав. ПАХОЎЦАВА АЛЕКСАНДРА ЛУКІЧА — нам. галоўнага інжынера, за выразнае аператыўнае кіраўніцтва мантажом і рацыянізатарскія мерапрыемствы, якія далі магчымасць пусціць станцыю ў кароткі тэрмін,—500 руб.

3) Тав. ШМАРАВА АЛЕГА БАРЫСАВІЧА — прараба па цеплямантажу — за ўдарную работу і высокія тэмпы па мантажу цеплавой насткі станцыі—ганаровай граматай і 600 р.

4) Тав. ГОЛУБАВА БАРЫСА АЛЕКСАНДРАВІЧА — інжынера па мантажу турбіны — за датэрміновы высокаякасны мантаж турбагенератара (замест двух месяцаў за 25 дзён)—ганаровай граматай і 700 руб.

5) Тав. ВАРНО СЯРГЕЯ АДАМАВІЧА — сакратара партыйнага калектыва — за мабілізацыю і арганізацыю мас, што забяспечыла датэрміновае сканчэнне будаўніцтва,—ганаровай граматай і 500 руб.

6) Тав. КАРДАШЭНКА СЯМЁНА МІХАЙЛАВІЧА — сакратара комсамольскага калектыва — за ўдарную работу па мабілізацыі комсамольцаў на выкананне плана будаўніцтва ЦЭЦ—ганаровай граматай і 500 руб.

7) Тав. КАВАЛЯ ФЁДАРА АРЦЁМАВІЧА — брыгадзіра чорнарабочых — за ўдарную работу па гідратэхнічных пабудовах—ганаровай граматай і 500 руб.

8) Тав. ШУЦІКА ВАСІКА ВАЛЬЕВІЧА — брыгадзіра комсамольскай брыгады — за ўдарную работу па выкананню плана — ганаровай граматай і пуцёўкай на курорт.

9) Тав. МАЛІНОЎСКУЮ МАРЫЮ ІСАКАЎНУ — брыгадзіра комсамольскай брыгады — за ўдарную работу па выкананню плана — ганаровай граматай і гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

10) САРАТАЎСКАГА ВЛАДЗІМІРА ГЕОРГІЕВІЧА—брыгадзіра электра-мантажа — за ўдарную работу і добрую якасць электрамантажа—ганаровай граматай і 500 руб.

11) Тав. ПУШКАРОВА ГЕОРГІЯ АЛЕКСАНДРАВІЧА — памочніка начальніка будаўніцтва — за ўдарную работу па правядзенню будаўнічых работ і выразнае аператыўнае кіраўніцтва—500 руб.

12) Тав. МАНУХІНА ВАСІЛІЯ АНДРЭЕВІЧА — намесніка начальніка будаўніцтва — за ўдарную работу па забеспячэнню будаўніцтва матэрыяламі і абсталяваннем—ганаровай граматай і 500 руб.

13) Тав. ГЛОБА ПАЎЛА ГРЫГОР'ЕВІЧА — майстра электрамантажа—за ўдарную і высокаякасную работу па электрамантажу—600 руб.

14) Тав. АГЕНЕЦ ГІРША ІСАЕВІЧА — старшыню рабочага камітэта—за арганізацыю работы мас на будаўніцтве—гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

15) Тав. ДЗЕМІДАВА ПАЎЛА ІВАНАВІЧА — кацельнага майстра—за датэрміновае і якаснае выкананне мантажа — ганаровай граматай і гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

16) Тав. ГРОГЕРА ДАВІДА АЎСЕЕВІЧА — брыгадзіра комсамольскай брыгады бетанішчыкаў — за ўдарную работу па бетону — ганаровай граматай і гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

17) Тав. МЯЦЕК ІОСІФА АНТОНАВІЧА — цесляра — за высокаякасную работу — гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

18) Тав. КАЗАК НІКАНА ІВАНАВІЧА — цесляра—за ўдарную работу па выкананню плана на эстакадзе—гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

19) Тав. ЛУКША НІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА — спесара — за ўдарную работу па мантажу турбагенератара—гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

20) Тав. АРЦЮХ ВЛАДЗІМІРА МАРТЫНАВІЧА — цесляра—за ўдарную работу — гадзіннікам з надпісам: «За ўдарную работу па будаўніцтву Менскай ЦЭЦ ад СНК БССР».

3. Для прэміравання іншых выдатных работнікаў, ІТР і ўдарнікаў пабудовы адпусціць у распараджэнне начальніка будаўніцтва 10 тыс. руб., а таксама адпусціць 11 тыс. руб. на арганізацыю ўрачыстага вечара, прысвечанага адкрыццю Менскай ЦЭЦ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Кіраўнік справ Совета Народных Камісараў БССР **С. ШАБОЛТАС.**

ПОСПЕХІ АДЗІНАГА ПРОЛЕТАРСКАГА ФРОНТА ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 11 (БЕЛТА).

«Юманіта» ў артыкуле Берліоза расцэньвае рашэнне сходу актывістаў социялістычнай федэрацыі дэпартамента Сены аб стварэнні адзінага фронта з компартыяй, як новы доказ магутнага росту рэволюцыйных настрояў у рабочым класе Францыі і пранікнення лозунга «Советы ўсюды» ў найглыбейшыя слаі працоўнага насельніцтва.

— Аб гэтым, — прадаўжае Берліоз, — гаворыць і той факт, што 469 галасоў былі паданы за прапанову аб пасылцы ў Маскву дэлегацыі для абмеркавання пытання аб «аднаўленні адзінства».

«Мы шчаслівы, — заключае Берліоз, — бачыць, як многія члены социялістычнай партыі паварочваюцца к III Інтэрнацыяналу».

Орган левай групы социялістычнай федэрацыі дэпартамента Сены «Этэнсель социялість» апублікаваў рэзалюцыю «камітэта садзейнасці рэволюцыйных социялістаў», якую гэта група ставіць на абмеркаванне засядаючага сёння нацыянальнага совета социялістычнай партыі. У рэзалюцыі падкрэсліваецца, што адзінства дзеянняў французскіх працоўных мас ужо дало свае плады, перашкодзіўшы ажыццяўленню фашысцкага путча.

— Прыклад Аўстрыі, — гаворыцца далей у рэзалюцыі, — даказвае, што палітыка «меншага зла» — гібельная. Рэзалюцыя настойвае ў першую чаргу на «умацаванні адзінства дзеянняў, а затым на стварэнні поўнага пролетарскага адзінства».

Нарэшце, рэзалюцыя патрабуе ад нацыянальнага совета социялістычнай партыі абмеркавання наступных прапаноў: 1) Паслаць у СССР дэлегацыю ў складзе прадстаўнікоў усіх плыняй социялістычнай партыі для абмеркавання з кіраўнікамі III Інтэрнацыянала практычных умоў ажыццяўлення адзінства дзеяння рабочага класа ва Францыі.

2) Адмяніць рашэнні з'ездаў социялістычнай партыі перашкаджаючыя адзінству дзеянняў. 3) Адмяніць рашэнні социялістычнай партыі, прынятыя раней супроць «левых». 4) Устанавіць пазіцыю социялістычнай партыі пры ўзнікненні вайны.

З-за перапаўнення канцэнтрацыйных лагераў у фашысцкай Германіі, для іх не хапае памяшканняў. У паблізу Брамена пабудован канц лагер для палітычных зняволеных на выцягнутым на бераг судне.

„НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ СОВЕТЫ"

АНТЫФАШЫСЦКІЯ ВЫСТУПЛЕННІ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 10 (БЕЛТА).

У Ажанвілер (дэпартамент Сомы) адбылася тысячная сялянская дэманстрацыя пад лозунгамі: «Далоў фашызм», «К'япа—у турму», «Няхай жыве Кашэн 1 Марці», «Няхай жывуць советы».

У дэпартаменце Ло-э-Гарон генеральная канфедэрацыя працоўных сялян правяла каля 40 сходаў у вёсках, на якіх прысутнічалі тысячы сялян.

У Бердэло пасля мітынга працоўных сялян, на якім выступаў комдэпутат Рэно Жан, арганізован камітэт барацьбы.

***

ПАРЫЖ, 11. (БЕЛТА).

У Сель-сюр-Шэр па закліку мясцовых арганізацый компартыі і социялістычнай партыі каля назначанага фашыстамі зборнага пункта сабраліся 2 тыс. рабочых і сялян бліжэйшых сёл. Не гледзячы на ўзмоцненыя жандарскія атрады, рабочыя за нялі залу сходаў і прымусілі фашыстаў уцякаць. На мітынгу адзінага фронта выступалі прадстаўнікі мясцовай комарганізацыі, социялістычнай партыі і таварыства «прыяцеляў СССР».

ПАУСТАННІ У МАРОКА ПРАДАУЖАЮЦЦА

ПАРЫЖ, 10 (БЕЛТА).

«Юманіта», каментуючы афіцыяльныя зводкі ваенных дзеянняў у Марока, падкрэслівае, што войскам удалося ўціхамірыць толькі некалькі тыс. чалавек у той час, як колькасць непакорных пляменняў дасягае 20 тыс. чалавек.

Побач з гэтым у тылу французскіх войск, паводле слоў газеты, прадаўжаюць выбухаць паўстанні ні быта ўціхаміраных пляменняў. «Юманіта» падкрэслівае, што паўстанцы ўзброены толькі вінтоўкамі і маюць некалькі кулямётаў, у той час, як французскія войскі, колькасць якіх дасягае 10 тыс. чалавек, узброены на апошняму слову ваеннай тэхнікі.

ЛУЦКІ ПРАЦЭС

ВАРШАВА, 9 (БЕЛТА).

Суд у Луцку, які разбірае справу 56 комуністаў, адхіліў патрабаванне абароны выклікаць у якасці сведкі былога міністра ўнутраных спраў Складкоўскага. Ён мог-бы пацвердзіць факт ужывання катаванняў, бо некалькі год назад у бытнасць міністрам унутраных спраў вымушан быў публічна заявіць, што распусціў папітычную паліцыю ў Луцку з прычыны таго, што яна прымяняла да арыштаваных «недапушчальныя метады».

ЦСПСБ ПРЭМІРУЕ

У адзнаку сканчэння будаўніцтва і пуску першай чаргі Менскай цеплаэлектрацэнтралі Прэзідыум ЦСПСБ пастанавіў адпусціць для прэміравання лепшых ударнікаў-энтузіястаў будаўніцтва—25 месц у дамы адпачынку і 10 месц у санаторый «Сасноўка».

15 сакавіка а 12 гадз. дня Беларускай Акадэміяй Навук

склікаецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ЗВЫШРАННЯЙ СЯЎБЕ.

Канферэнцыя адбудзецца ў агульнай залі акадэміі (рог Ленінскай і Універсітэцкай, 29-35, 2 паверх).

Прэзідыум Бел. АН.

ЗАГАД

па Народнаму камісарыяту асветы БССР

10 сакавіка 1934. г. Менск.

Арганізацыю пры менскім педінстытуце «інстытута выхаднога дня» УХВАЛІЦЬ, як мерапрыемства, маючае вялікае значэнне ў справе павышэння кваліфікацыі настаўніцтва сярэдняй школы.

За праўленую ў гэтай справе ініцыятыву кіраўніцтву менскага педінстытута абвясціць падзяку.

Прапанаваць дырэктарам гомельскага, віцебскага, магілеўскага педінстытутаў арганізаваць «інстытуты выхаднога дня» пры гэтых інстытутах.

Загадчыкам Менскага, Гомельскага, Віцебскага і Магілеўскага раёнаў забяспечыць наведванне «інстытутаў выхаднога дня» настаўнікамі сярэдняй школы.

Школьнаму кіраўніцтву НКА вылучыць грашовыя сродкі, патрэбныя на аплату выкладчыкаў і абслугоўванне «інстытута выхаднога дня», абавязаўшы адпаведныя аддзелы нарасветы прымаць удзел у фінансаванні гэтага мерапрыемства са сродкаў на павышэнне кваліфікацыі педагогаў.

Прасіць ЦП саюза працасветы вылучыць з свайго боку суму грашовых сродкаў, патрэбных на арганізацыю мастацкіх частак, якімі будуць суправаджацца заняткі ў «інстытутах выхаднога дня».

Абавязаць кіраўніцтва падрыхтоўкі настаўнікаў НКА забяспечыць арганізуемыя «інстытуты выхаднога дня» неабходнымі навучальнымі планамі і даць патрэбныя ў справе арганізацыі ўказанні.

Народны камісар асветы БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

Абавязковая пастанова № 5

Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

7 сакавіка 1934 г. г. Менск.

Аб ахове грамадзкага парадку ў гор. Менску

Менскі гарадскі совет пастанаўляе:

1. Забараніць ва ўсіх месцах грамадзкага карыстання ў горадзе Менску — у памяшканнях устаноў, на вуліцах, пляцах, садах, скверах, нагонах трамвая, аўтабусах, тэатрах, кіно, клубах, сталовых, чайных, магазінах—парушыць агульны парадак і цішыню крыкам і лаянкай і паяўленне на вуліцах і грамадскіх мясцах асобам у стане відавочнага ап'янення.

2. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці — штрафу ў памеры 3-х рублёў, які спагнаецца на месцы парушэння міліцыянерам, або членам брыгады садзейнасці міліцыі з абавязковай выдачай квітка аб уплаце штрафа, у выпадку адмовы заплаціць штраф на месцы парушэння складаецца пратакол у накладанні штрафа да 9 руб., або прымусовым работам да 3-х дзён.

УВАГА: Асобы, якія з'яўляюцца на вуліцах і грамадзкіх мясцах у п'яным выглядзе, дастаўляюцца ў міліцыю, дзе і затрымліваюцца да адцверажэння і штрафуюцца да 25 руб., або прымусовымі работамі да 6 дзён.

3. Нагляд за выкананнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на Р.-С. міліцыю.

4. Гэта абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу з часу яе апублікавання.

Нам. старшыні Менгарсовета ШУЛЬКІН.
Сакратар Менгарсовета КАПЕЛЕВІЧ.

Абавязковая пастанова № 6

Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

8 сакавіка 1934 г. г. Менск.

Пра супроцьпажарную ахову ў гор. Менску і раёне

У мэтах папярэджання пажару на прадпрыемствах, установах, гандлёва-каператыўных складах, жактах, домаўладаннях, пабудовах, кіно, тэатрах, клубах, навучальных установах, больніцах і інш. грамадзкіх мясцах, у калгасах, саўгасах, сельскіх мясцовасцях, Менскі гарадскі совет пастанаўляе:

1. Зацвердзіць правілы пра супроцьпажарную ахову ў г. Менску і ў сельскіх мясцовасцях Менскага раёна.

2. Абавязаць усе прадпрыемствы, установы, домакіраўніцтвы і іншыя арганізацыі кіравацца выпрадаванымі правіламі пра супроцьпажарную ахову.

УВАГА: Правілы пра супроцьпажарную ахову можна набыць у кіраўніцтве пажарнай аховы г. Менска.

3. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці — штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.

УВАГА: За парушэнне часткі 1-я, § 1, літ. «б.» правіл аб курэнні ў відавочных памяшканнях і ўстановах, вінаватыя падлягаюць штрафу ў суме 3-х руб. Пры адмове заплаціць штраф на месцы, складаецца акт таксы для накіравання ў аддзяленне міліцыі для накладання штрафу да 25 руб.

4. Нагляд за выкананнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на кіраўніцтва пажарнай аховы г. Менска, на міліцыю і сельсоветы.

5. Пастанова ўваходзіць у моц з дня яе апублікавання.

Нам. старшыні Менскага гарсовета ШУЛЬКІН.
Сакратар гарсовета КАПЕЛЕВІЧ.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — ПРЭМ'ЕРА! ПАРУЧЫК КІЖЭ. У праграме гукавая кіно-хроніка

Кіно ПРОЛЕТАРЫЯ — 4-я заключная серыя ВОСТРАЎ ТАЙН

Дзіцячы Гукавы кіно-тэатр — Мастацкі гістарычны фільм з эпохі парыжскай камуны ЛЮЛЬКА КОМУНАРА. У праграме гукавая хроніка

Кіно Інтэрнацыянал — Мастацкі замежны фільм КАХАННЕ ІСПАНКІ

Кіно „СПАРТАК" — Замежны мастацкі фільм Каханне і злачынства

Заўтра ў рабочым хлебакамбінаце з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці, пасля кароткай хваробы, нам. дырэктара хлебакамбіната тав. ГРЫНГЛАЗА П. А. Пахаванне адбудзецца 13 сакавіка у 5 гадзін вечара, з памяшкання клуба хлебазавода.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА „ТОРГСИН" аб'яўляе, што з 1-га сакавіка АДКРЫТ — КАМІСІЙНЫ МАГАЗІН у г. Менску ПА ЛЕНІНСКАЙ, 14 (супроць Цэнтральнай аптэкі). Магазін ПРЫМАЕ на камісію розныя гістарычныя рэчы, МЯХІ, КАЎРЫ, ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ, АБУТАК, ВЕЛАСІПЕДЫ, ШВЕЙНЫЯ МАШЫНЫ, ГАДЗІННІКІ і інш. ТАВАРЫ. Разлікі з кліентамі праводзяцца пасля продажы здадзеных тавараў на камісію. Плата праводзіцца таварнымі кніжкамі „ТОРГСИНА". Кліенты, атрымаўшыя таварныя кніжкі „ТОРГСИНА", могуць атрымаць любыя тавары і ў любой колькасці ва ўсіх магазінах г. Менска. Белкантора „ТОРГСИН".

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛІ З ДРУКУ

ДАРОЖКІН Н. А.—праф.—Галаўнёвыя захворванні зернавых культур і меры барацьбы з імі, тыр. 4.000, стар. 64, ц. 75 к.

Праф. БАХЦЕЕЎ і ПІЛЬКО.—Прыгатаванне і ўжыванне тарфяных угнаенняў на падзолістых глебах БССР. Тыр. 3 000, стар. 24, ц. 40 к.

ГРЫШЫН З.—Маркса ленінскае вучэнне аб арганізацыі і дысцыпліне працы. Тыр. 1.500, стар. 48, ц. 1 р.

БРЫХНІЧОЎ І. Н., Д. І. МЕНДЕЛЕЕЎ.—(Да стогоддзя з дня нараджэння). Тыр. 2.000, стар. 104, ц. 1 р. 50 к.

ІНСТЫТУТ ПСІХА-НЕЎРАЛОГІІ.—Зборнік прац, том II. Тыр. 750, стар. 188, ц. 2 р. 75 к.

ІНСТЫТУТ ЯЎРЭЙСКАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ.—На навуковым фронце № 3—4. Тыр. 1.000, стар. 216, ц. 2 руб.

КНІГІ ПРАДАЮЦЦА ва ўсіх кнігарнях ДВБ, БАКТ'а, райспажыўсаюзаў, кнігарні КОГІЗ'а, г. Менску.

Менск, друкарня «Звязды». Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ. Упаўн. Гапоўлітбала № К—2493.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2